ШЛЮБ ВАЧЫМА СУПРАЦОЎНІКАЎ ЗАГСА

Сямейная

ЗВЕЗЛІ ХУТАРЫ – АТРЫМАЛІ СЯЛО 15

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

31 СТУДЗЕНЯ 2019 г. ЧАЦВЕР № 20 (28887)

ЛІЧБА ДНЯ

60,8 %

склала доля ўрачоў агульнай практыкі ў агульнай колькасці ўрачоў, якія працуюць у сістэме аказання першаснай медыцынскай дапамогі, на 1 студзеня 2019 года. У краіне праводзіцца паэтапны пераход да агульнаўрачэбнай практыкі з укараненнем арганізацыі работы ўчастковай службы па прынцыпе каманды: урач агульнай практыкі — памочнік урача — медыцынская сястра агульнай практыкі. У плане падрыхтоўкі нарматыўнай базы зроблена ўсё неабходнае, засталося працаваць на месцах па яе рэалізацыі. Сярод прыярытэтаў — развіццё персаніфікаванай медыцыны.

КАРАТКА

• Экспарт беларускай сельгаспрадукцыі за 2018 год перасягнуў $5 млрд.

• **У Гомельскай АКБ пачалі функцыянаваць хірургічнае таракальнае і алергалагічнае аддзяленні.**

• **Брэсцкі абласны краязнаўчы музей да 1000-годдзя горада прэзентаваў праект «12 артэфактаў».**

• Сямі жыхарам Стаўбцоўскага раёна прызначылі курс прышчэпак з-за кантакту з шалёным ваўком.

• **У Гродне эвакуявалі вучняў і калектыў гімназіі № 9 з-за хлуслівага паведамлення аб мініраванні.**

ISSN 1990 - 763X

ГАСПАДЫНЯ БАТЛЕЙКІ

Цікавая творча-працоўная біяграфія ў работніцы Плешчаніцкага дома культуры, кіраўніцы дзіцячай батлейкі Яніны БАРЫЧЭЎСКАЙ. Яніна Андрэеўна скончыла Ленінградскі інстытут воднага транспарту, працавала інжынерам-канструктарам у сістэме ветраэнергетыкі, больш за дзесяць гадоў загадвала Заслаўскім загсам. З цягам часу вярнулася на сваю малую радзіму, звязала лёс з мастацкай самадзейнасцю, стала выступаць з сольнымі песеннымі нумарамі на канцэртах. Дзякуючы неспакойнаму і творчаму характару Яніна Андрэеўна загарэлася ідэяй аднавіць старажытны лялечны тэатр, і ўжо цэлы год плешчаніцкая батлейка вандруе па суседніх вёсках, цешыць малодшых школьнікаў і дашкалят. Цікава, што лялькі для спектакляў (а ў тэатральнай калекцыі каля трох дзясяткаў персанажаў) робіць сама Яніна Барычэўская.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

На парадку дня

За межамі мегаполіса, але побач з ім

Як даць штуршок развіццю гарадоў-спадарожнікаў? Сенатары разам са спецыялістамі шукаюць выйсце з будаўнічага крызісу

Развіваць інфраструктуру ў гарадах-спадарожніках Мінска неабходна за кошт бюджэтаў як Мінскай вобласці, так і сталіцы. Такая прапанова прагучала падчас абмеркавання праблемных пытанняў у будаўнічай галіне за круглым сталом, арганізаваным Пастаяннай камісіяй Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах на базе індустрыяльнага парка «Вялікі камень».

Фота Андрэя САЗОНАВА.

— Сёння не будзе забароненых тэм, — падкрэсліў **старшыня Пастаяннай камісіі Уладзімір ПАНЦЮХОЎ** *(на фота)*. — У будаўнічай галіне надышоў крызіс, і нам неабходна праманіторыць практыку прымянення закона «Аб архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь».

Праца ў гэтым кірунку будзе весціся на працягу года, парламентарыі спадзяюцца, што здолеюць такім чынам удасканаліць заканадаўства ў будаўнічай сферы і гэта дапаможа вырашыць праблему.

Так, у прыватнасці, размова за круглым сталом у кітайска-беларускім індустрыяльным парку была прысвечана забудове гарадоў-спадарожнікаў Мінска. Тэмпы рэалізацыі адпаведнай праграмы, прынятай яшчэ ў 2014 годзе, — недастатковыя. Таму на яе рэалізацыю прапануецца перанакіраваць частку сродкаў са сталічнага бюджэту.

СТАР. 4

Традыцыі малой радзімы

НЕ ХАПАЕ ТОЛЬКІ ГУСІ Ў БРОНЗЕ

АЛЕ ГЭТА СПРАВА ЧАСУ, АБЯЦАЮЦЬ У БЕЛАЙ ДУБРОВЕ

Пра Святога Афанасія, або па-народнаму — Апанаса, свята якога адзначаецца ў апошні дзень студзеня, у аграгарадку Белая Дуброва Касцюковіцкага раёна ведаюць нават малыя. Святы — заступнік гусей, а гэта птушка тут самая ўшанаваная. Гусінае «га-га-га» пачуць можна ў любым канцы населенага пункта, але асабліва гучна яно даносіцца са двароў, што прылягаюць да ракі Беседзь і яе прытока Дзяражанкі. Старажылы прыгадваюць, што калісьці ўся рэчка была белая ад гэтай птушкі. Зараз аматараў сярод сяльчан засталося меней. Але былая гусіная слава так і засталася за Белай Дубровай. Яе нават ахрысцілі гусінай сталіцай. І прыдумалі фестываль.

СТАР. 13



Гусі яшчэ і ахоўнікі надзейныя.

Парламенцкі дзённік

На вясновай сесіі разгледзяць 36 законапраектаў

Пра гэта паведаміў старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА на савеце ніжняй палаты парламента. Акрамя таго, ён адзначыў, што да канца года чакаецца паступленне яшчэ 30 планавых дакументаў.

Фота БелТА.

«Летась мы прынялі некалькі сур'ёзных дакументаў у развіццё дэкрэтаў Прэзідэнта. Гэту працу трэба паслядоўна працягваць пры падрыхтоўцы законапраектаў аб гаспадарчых таварыствах, натуральных манаполіях, плацежных паслугах, інавацыйнай і аўдытарскай дзейнасці, — растлумачыў Уладзімір Андрэйчанка. — У хуткім часе пачнецца праца па бюджэце. Яго неабходна адаптаваць да сучасных эканамічных рэалій. Акрамя таго, мы дамовіліся працягнуць працэс удасканалення падатковага заканадаўства, якое павінна больш актыўна стымуляваць дзелавую ініцыятыву. Усе гэтыя пытанні павінны быць на кантролі парламентарыяў».

Старшыня Палаты прадстаўнікоў адзначыў, што запланавана 35 мерапрыемстваў па вывучэнні правапрымяняльнай практыкі. «Важна, каб іх вынікамі былі канкрэтныя заканадаўчыя ініцыятывы», — падкрэсліў ён.

Намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Баляслаў ПІРШТУК удакладніў, што на найбліжэйшай сесіі будуць разглядацца 12 законапраектаў у першым чытанні, 17 — у другім, і яшчэ сем ратыфікацый. «Але не бывае галоўных і другарадных законапраектаў — усе яны актуальныя для пэўных сфер дзейнасці, груп насельніцтва», — падкрэсліў Баляслаў Пірштук.

Таксама намеснік старшыні анансаваў, што 2—4 мая ў сталіцы пройдзе канферэнцыя Групы падтрымкі Шаўковага шляху ПА АБСЕ. У гэту суполку ўваходзяць 23 краіны. Мерапрыемства стане адной з найбольш важных міжнародных падзей у гэтым годзе.

Надзея АНІСОВІЧ.

Май на ўвазе!

Павялічаны мінімальныя спажывецкія бюджэты

З 1 лютага павышаюцца памеры мінімальных спажывецкіх бюджэтаў для розных сацыяльна-дэмаграфічных груп у сярэднім на душу насельніцтва і на аднаго члена сям'і рознага складу. Новыя памеры ў сярэдніх цэнах снежня 2018 года ў разліку на месяц зацверджаны пастановай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны ад 23 студзеня 2019 года № 5. Яны будуць дзейнічаць у перыяд з 1 лютага да 30 красавіка 2019 года.

Памеры мінімальных спажывецкіх бюджэтаў складуць:
працаздольнае насельніцтва — 451 рубель;
пенсіянеры — 353 рублі 52 капейкі;
студэнты — 333 рублі 88 капеек;
дзеці ва ўзросце да трох гадоў — 284 рублі 17 капеек;
дзеці ва ўзросце ад трох да шасці гадоў — 373 рублі 58 капеек;
дзеці ва ўзросце ад шасці да васямнаццаці гадоў — 382 рублі 31 капейка;
сям'я з чатырох чалавек — 351 рубель 28 капеек;
маладая сям'я з трох чалавек — 382 рублі 11 капеек.

У Мінпрацы і сацабароны нагадваюць, што сярэднедушавы мінімальны спажывецкі бюджэт сям'і з чатырох чалавек служыць асновай для вызначэння права грамадзян на атрыманне льготных крэдытаў і субсідый на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў; грамадзян, якія пастаянна пражываюць і працуюць у населеных пунктах з колькасцю насельніцтва да 20 тысяч чалавек, — ільготных крэдытаў на капітальны рамонт і рэканструкцыю жылых памяшканняў, будаўніцтва інжынерных сетак, узвядзенне гаспадарчых памяшканняў і пабудоў.

Удзельная вага асноўных артыкулаў спажывецкіх выдаткаў у мінімальным спажывецкім бюджэце сям'і з чатырох чалавек у цэнах снежня 2018 года характарызуецца наступнымі данымі: прадукты харчавання — 48,6 %, адзенне, бялізна, абутак — 19,1 %, жыллёва-камунальныя паслугі — 8,3 %, бытавыя паслугі, транспарт, сувязь — 9,1 %, мэбля, прадметы культурна-бытавога і гаспадарчага прызначэння — 9,0 %, культурна-асветныя мерапрыемствы і адпачынак — 1,4 %, узносы і плацяжы — 2,1 %, лекавыя сродкі, прадметы санітарыі і гігіены — 2,4 %.

Святлана БУСЬКО.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Брытанскі парламент прагаласаваў супраць «брэксіту» без пагаднення

Брытанскія парламентарыі выказалі сваю пазіцыю па шэрагу пытанняў, звязаных з «брэксітам», даўшы прэм'еру Тэрэзе Мэй дакладную праграму на чарговы раўнд перагавораў з Еўрасаюзам. Дэпутаты пацвердзілі, што ў цяперашнім выглядзе пагадненне з ЕС не падтрымліваюць, выступаюць супраць выхаду з Еўрасаюза без пагаднення, хочуць змены ўмоў па Паўночнай Ірландыі, але пры гэтым узяць адказнасць на сябе за распрацоўку ўмоў «брэксіту» негатовыя. Кіраўнік Еўракамісіі Жан-Клод Юнкер, як і іншыя палітыкі ЕС, не раз казалі Тэрэзе Мэй, што Еўрасаюз не можа і не хоча аднаўляць перагаворы па праекце пагаднення аб выхадзе Брытаніі. Праз два тыдні ў Палаце абшчын мяркуецца правесці другое галасаванне па тым жа праекце пагаднення.

Краіны «ядзернай пяцёркі» адмовіліся ўзгадніць тэкст сумеснай заявы

Падчас пасяджэння ў Пекіне прадстаўнікі краін «ядзернай пяцёркі» адмовіліся ад узгаднення выніковага сумеснай заявы «з-за абвастрэння супярэчнасцяў», заявіў намеснік кіраўніка МЗС Расіі Сяргей Рабкоў. Па словах дыпламата, у ядзерныя дактрыны «некаторых краін» уносяцца змены, якія зніжаюць парог прымянення ядзернай зброі. Рабкоў адзначыў, што «сітуацыя ў сферы міжнароднай бяспекі не толькі не стабілізавалася, але працягвала дэградаваць, узровень канфліктнага патэнцыялу дасягнуў вельмі небяспечнай рысы». Акрамя таго, ён адзначыў тэндэнцыю да разгойдвання рэжыму нераспаўсюджвання ядзернай зброі, якая пагражае сур'ёзнымі наступствамі. «Не можа не трывожыць, што ўсе гэтыя падзеі адбываюцца на фоне паглыблення дэфіцыту ўзаемнага даверу паміж членамі «ядзернай пяцёркі», што з'яўляецца беспрэцэдэнтным выклікам для дадзенага фармату», — сказаў расійскі дыпламат, выступаючы на канферэнцыі ў кітайскай сталіцы. Ён таксама адзначыў, што на гэтым фоне назіраецца «відавочнае зніжэнне ўзроўню стратэгічнай стабільнасці». Як вядома, «ядзернай пяцёркай» называюць нефармальнае аб'яднанне дзяржаў, якія валодаюць ядзернай зброяй. У яго ўваходзяць Расія, Кітай, Вялікабрытанія, ЗША і Францыя. Афіцыйная сустрэча каардынатараў пяці краін прайшла ўчора ў закрытым фармаце. На ёй абмеркавалі палітыку кожнай з краін, а таксама ядзерную энергетыку і раззбраенне. Сёння ў Пекіне адбудзецца канферэнцыя, у якой, акрамя афіцыйных дэлегацый, прымуць удзел эксперты, прадстаўнікі няўрадавых арганізацый і вайскоўцы.

Названыя найбуйнейшыя сусветныя аўтавытворцы



Нямецкі канцэрн Volkswagen AG захаваў лідарства ў спісе найбуйнейшых аўтавытворцаў ў свеце, паведамляе агенцтва Bloomberg. Кампанія ўтрымлівае першае месца трэці год запар. Летась Volkswagen рэалізаваў 10,8 мільёна машын — на 0,9 працэнта больш, чым у 2017-м. Акрамя аднайменнага брэнда ў статыстыцы ўлічваліся продажы марак легкавых і спартыўных аўтамабіляў Audi, Bentley, Bugatti, Porsche, Lamborghini, SEAT, Skoda, а таксама грузавікоў MAN і Scania. На другой пазіцыі размясцілася японская карпарацыя Toyota. Продажы кампаніі ў мінулым годзе выраслі на два працэнты — да 10,6 мільёна машын. Другі японскі аўтаканцэрн — Nissan — даў справаздачу аб 5,65 мільёна прададзеных аўтамабіляў.

Блізкая ўлада

«НЕ ЎПЭЎНЕНЫЯ — НЕ АБЯЦАЙЦЕ, А ДАЛІ СЛОВА — ВЫКАНАЙЦЕ!»

Як працуе са зваротамі грамадзян мясцовая ўлада, высвятлялі на пасяджэнні Віцебскага аблвыканкама. Свае думкі выказалі старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Леанід Анфімаў і начальнік галоўнага ўпраўлення па зваротах грамадзян і юрыдычных асоб Адміністрацыі Прэзідэнта Рыгор Шлык. І прывялі прыклады раўнадушша чыноўнікаў. Некаторыя вельмі здзіўляюць.

Агучыла леташнюю статыстыку **начальнік аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Ілона ШУЛЬГА.** Больш за 38,7 тысячы зваротаў зарэгістравана ў аблвыканкаме, гар- і райвыканкамах, адміністрацыях трох раёнаў Віцебска. І гэта на 8 % менш, чым пазалетась. Колькасць паўторных зваротаў таксама скарацілася — на 7 %, а пераадрасаваных з вышэйстаячых структур — на 6 %.

У рэйтынгу зваротаў на першым месцы — ва ўпраўленне ўнутраных спраў — 3110, у галоўнае ўпраўленне ЖКГ — 1163, аховы здароўя — 951...

Пры гэтым па камунальных праблемах колькасць «сігналаў» павялічылася на 36 %. Дадалося зваротаў наконт рамонту дахаў, стыкаў сценавых панэляў, утрымання дапаможных памяшканняў.

Дарэчы, **першы намеснік губернатара Віцебшчыны Алег МАЦКЕВІЧ** даволі рэзка выказаўся па тэме. Ён растлумачыў, што не трэба людзям у якасці адказаў адпраўляць адпіскі, асабліва, што датычыцца рамонту дамоў. Не плануецца сёлета, ці налета пачынаць работы, дык і трэба гэта канстатаваць. Неабходна канкрэтызаваць, калі заяўка жыльцоў будзе задаволена. А калі ўжо паабяцалі нешта выканаць у канкрэтны тэрмін, кроў з носа, а слова трэба трымаць. І кіраўніку, перад тым як падпісваць ліст, трэба ўважліва разабрацца. Ці ўсё яго падначаленыя, аўтары адказу, высветлілі. Можа, трэба было выехаць ды падысці на месца, каб пагутарыць з жыльцамі праблемнага, на іх погляд, дома?

Віцэ-губернатар нагадаў, што, калі ўскрываюцца факты раўнадушша чыноўнікаў, апошнім могуць аб'явіць вымову, панізіць клас дзяржслужачага, наогул звольніць... І адказным асобам трэба не забывацца пра Дэкрэт Прэзідэнта № 2 аб удасканаленні работы з насельніцтвам.

Толькі летась за парушэнне заканадаўства аб зваротах прыцягнулі да дысцыплінарнай адказнасці 161 чыноўніка.

Начальнік галоўнага ўпраўлення па зваротах грамадзян і юрыдычных асоб Адміністрацыі Прэзідэнта Рыгор ШЛЫК агучыў прыклады таго, як не трэба працаваць з людзьмі. У прыватнасці, расказаў пра скаргу, што датычылася неабходнасці рамонту лаўкі каля жылога дома. Заяўніца ў Віцебску не знайшла падтрымкі ў вырашэнні гэтай, на першы погляд, дробнай праблемы. Таму і зрабіла выснову, што тыя, каму спрабавала давесці інфармацыю, «не на сваім месцы». І была вельмі здзіўлена, што яе зварот не застаўся без увагі. Напэўна, яшчэ больш, калі прадстаўнік Адміністрацыі кіраўніка дзяржавы потым тэлефанаваў, каб праверыць, ці задаволенымі засталіся людзі. Аказалася, што лаўку адрамантавалі, але... як кажуць у народзе, на так-сяк.

А яшчэ ён успомніў зварот наконт дрэннага функцыянавання электрапліт у адным з інтэрнатаў у Оршы. Праблема аказалася «з барадой». І станоўча была вырашана пасля ўмяшання Адміністрацыі...

Старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Леанід АНФІМАЎ расказаў пра скаргу з Талачынскага раёна наконт праблемы з забяспечанасцю вадой. У доме жыве шматдзетная сям'я, якая насіла ваду ў вёдрах з сажалкі метраў за сто. Каб не толькі прыгатаваць ежу, памыць нешта, памыцца самім, але і скаціну напаіць. Дык чаму мясцовая ўлада не паклапацілася аб людзях? Пры гэтым, як і ва ўсёй краіне, агітуюць насельніцтва ствараць і развіваць падсобныя гаспадаркі. Леанід Анфімаў лічыць, што не павінна быць для чыноўнікаў «маленькіх праблем» грамадзян. Бо, калі скардзяцца, для іх яны глабальныя.

Ён заклікаў вучыцца гутарыць з людзьмі так, каб яны не сыходзілі пакрыўджанымі на ўладу.

Канешне, ёсць так званыя прафесійныя скаржнікі. У іх лісты да ўлады, званкі на прамыя лініі, наведванне асабістых прыёмаў, мякка кажучы, хобі. Але і з такімі трэба паводзіць сябе так, каб зразумелі, што да іх аднесліся з павагай і выслухалі з увагай. Можа, калі-небудзь «прафесіянал» і зразумее, што не мае рацыі?

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Кватэрнае пытанне

ПРАБЛЕМУ ЖЫЛЛЯ ДЛЯ ШМАТДЗЕТНЫХ ВЫРАШАЦЬ ЗА ДВА ГАДЫ

Аб гэтым паведаміў начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр Аўраменка.

Усяго за мінулы год у краіне было пабудавана 3 мільёны 966 тысяч квадратных метраў жылля. У тым ліку для шматдзетных пабудавана 604 тысячы 567 квадратаў, па класе «арэнднае жыллё» — больш за 125 тысяч. Сёлета арэнднага жылля плануецца ўзвесці каля 135 тысяч квадратных метраў.

НЕ БОЛЬШ ЗА 1025 РУБЛЁЎ ЗА МЕТР

«Стаіць задача перад усімі дзяржаўнымі і камерцыйнымі забудоўшчыкамі, якія будуць будаваць жыллё для тых, хто мае патрэбу, каб кошт квадратнага метра быў ніжэйшы, чым сярэднямесячны налічаны даход насельніцтва. Гэтая задача была пастаўлена кіраўніцтвам дзяржавы, і ў мінулым годзе яна была дасягнута», — расказвае Аляксандр Аўраменка.

Нагадаем, што, паводле вынікаў мінулага года, «квадрат» з дзяржпадтрымкай каштаваў 841,95 рубля пры плане 923,16 рубля. А кошт квадратнага метра для тых, хто будуецца з дзяржпадтрымкай, да канца 2019 года не будзе перавышаць 1025 рублёў.

У ЧАРЗЕ ГОД

Бягучы год і 2020-ы будуць напружанымі. «Мы павінны за два гады забяспечыць усіх шматдзетных, што стаяць больш за год у чарзе тых, хто мае патрэбу, жыллём. Калі не расхалоджвацца, ёсць магчымасць не толькі выканаць, але і перавыканаць гэты план», — удакладняе пазіцыю міністэрства Аляксандр Аўраменка.

Сёлета ў краіне разлічваюць пабудаваць 4 млн квадратных метраў жылля. З іх 960 тысяч «квадратаў» — для шматдзетных чаргавікоў.

У краіне сёння 34 838 шматдзетных сем'яў, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Частка з іх ужо будуецца. Кіраўніцтва краіны паставіла задачу, каб яны стаялі ў чарзе не больш за год. І ў далейшым, па словах начальніка ўпраўлення, плануецца выйсці на формулу, калі шматдзетная сям'я павінна стаяць у чарзе не больш за 12 месяцаў.

«Не буду казаць пра тыя сем'і, якія, калі падыходзіць чарга будавацца, адмаўляюцца і прапускаюць яе. Але тыя, хто знаходзіцца на чарзе і хто хоча будавацца, будуць забяспечаны жыллём. Усе магутнасці для гэтага ёсць. І тэрыторыю знойдзем, і рэсурсы, а дзяржава таксама паклапацілася аб ільготных крэдытах. Цяпер пытанне ў тым, каб арганізавацца».

Згодна з планамі на бягучы год для шматдзетных сем'яў, якія стаяць на ўліку тых, хто мае патрэбу, пабудуюць 12 тысяч кватэр. З іх у Мінску — 1896, у Брэсцкай вобласці — 2508, у Мінскай — 2112 кватэр.

СІСТЭМА БУДЗБЕРАЖЭННЯЎ І ІПАТЭКА

Начальнік упраўлення закрануў і тэму жыллёва-будаўнічых зберажэнняў. У Міністэрстве разлічваюць, што гэта сістэма запрацуе ў нас у краіне да канца гэтага года. Праект указа па сістэме жыллёва-будаўнічых зберажэнняў ужо падрыхтаваны, і чакаецца, што днямі ён будзе накіраваны ў апарат Савета Міністраў для далейшай працы з ім. А далей Саўмін накіруе яго на ўзгадненне ў адпаведныя дзяржорганы.

Аляксандр Аўраменка адзначыў, што дадзеная тэма абмяркоўвалася ў краіне даўно: больш за 15 гадоў ідэя лунала ў паветры, але ў сілу шэрагу прычын не была рэалізаваная. Па выніках некалькіх нарад ва ўрадзе пад кіраўніцтвам віцэ-прэм'ера Уладзіміра Кухарава атрымалася знайсці пункты судакранання.

Паводле яго слоў, з ухваленнем сістэмы жыллёва-будаўнічых зберажэнняў у людзей будзе яшчэ адна магчымасць хутчэй пабудаваць жыллё. Гэта датычыцца і грамадзян, якія не адносяцца да катэгорыі тых, хто мае патрэбу.

Што датычыцца ўвядзення іпатэкі, то гэтым пытаннем займаецца Міністэрства эканомікі. «Але мы ведаем, што адпаведны дакумент ужо практычна падрыхтаваны», — сказаў прадстаўнік Мінбудархітэктуры.

ПРАБЛЕМНЫЯ ДАМЫ ДАБУДУЮЦЬ ДА 1 ЛІПЕНЯ

«Усе звышнарматыўныя дамы, якія былі выяўлены па заканчэнні мінулага года, будуць уведзены ў строй да канца першага паўгоддзя. Гэтыя дамы на строгім кантролі», — адзначыў Аляксандр Аўраменка. Паводле прагнозу прадстаўніка міністэрства, многія са звышнарматыўных дамоў будуць уведзеныя раней гэтага тэрміну.

Так, на пачатак 2019 года ў краіне было зарэгістравана 19 жылых дамоў, будаўніцтва якіх вялося з перавышэннем нарматыўных тэрмінаў. У тым ліку ў Віцебскай вобласці было чатыры дамы, у Гродзенскай — тры, у Мінскай — дзевяць, у Мінску — тры дамы.

Каб вырашыць праблемы са з'яўленнем звышнарматыўных дамоў, прапануецца дазволіць мяняць тэрміны будаўніцтва па жылых дамах не больш як адзін раз. Адпаведныя змены могуць унесці ў правілы заключэння і выканання дагавораў будаўнічага падраду. «У цяперашні час падрыхтавана змяненне ў пастанове Мінбудархітэктуры, дзе будзе прапісана, што можна падаўжаць толькі адзін раз», — удакладніў Аляксандр Аўраменка.

ПІЛОТНЫ ПРАЕКТ АБ ГОРАДЗЕ-СПАДАРОЖНІКУ

Рашэнне аб такім праекце па будаўніцтве жылля для мінчан у Смалявічах прымуць у найбліжэйшы час. Праект ужо падрыхтаваны і знаходзіцца ў Адміністрацыі Прэзідэнта. «Мы чакаем, што ў самы бліжэйшы час будзе нейкі вынік. Спадзяёмся, што такі дакумент будзе падпісаны», — адзначыў Аляксандр Аўраменка.

Прадстаўнік Мінбудархітэктуры растлумачыў, што пры станоўчым рашэнні па праекце пачатак будаўніцтва дома ў Смалявічах будзе дадаткова анансавацца і чаргавікі змогуць падаць заявы. «З тых людзей, хто выявіць жаданне і падасць заяву, будуць абраныя тыя, хто даўжэй за ўсё стаіць на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў», — расказаў Аляксандр Аўраменка.

Сяргей КУРКАЧ.

На слыху

БЕЛАРУСЬ ВЫСТУПІЦЬ НА «ЕЎРАБАЧАННІ-2019» 14 МАЯ

Яшчэ невядома, хто прадставіць сёлета нашу краіну на міжнародным конкурсе «Еўрабачанне», але ўжо адбыўся папярэдні падзел будучых канкурсантаў па паўфіналах. Папярэдняя жараб'ёўка і перадача сімвалічных ключоў ад конкурсу прайшлі ў Тэль-Авіве.

Паводле жараб'ёўкі, Беларусь выступіць 14 мая ў першай частцы першага паўфіналу. Кампанію нашай краіне складуць Славенія, Чэхія, Чарнагорыя, Кіпр, Сербія, Фінляндыя, Польшча, Венгрыя, а ў другой палове гэтага ж паўфіналу выступяць Эстонія, Партугалія, Сан-Марына, Ісландыя, Грузія, Аўстралія, Бельгія, Украіна і Грэцыя. Яшчэ 18 краін выступяць у другім паўфінале, 16 мая.

Жараб'ёўка таксама вызначыла, якія паўфіналы будуць трансляваць і адпаведна ў якіх прагаласуюць «вялікая пяцёрка» краін — заснавальніц конкурсу (Вялікабрытанія, Германія, Іспанія, Італія, Францыя) і прымаючая краіна — Ізраіль. Так, 14 мая галасуюць і тэарэтычна могуць падтрымаць нашага ўдзельніка балами Ізраіль, Іспанія і Францыя, 16 мая — Італія, Вялікабрытанія і Германія. «Мы пачынаем адлік часу да мая і з нецярпеннем чакаем магчымасці вітаць усіх удзельнікаў у Тэль-Авіве», — адзначыў выканаўчы прадзюсар конкурсу Ян Ола Санд. Дарэчы, ужо ў лютым у продаж паступіць «першая хваля» білетаў на канцэрты «Еўрабачання-2019».

Тым часам да 31 студзеня Белтэлерадыёкампанія працягвае прымаць электронныя заяўкі ад удзельнікаў нацыянальнага адбору на «Еўрабачанне». Жывое праслухоўванне кандыдатаў адбудзецца 4 лютага, а фінальны гала-канцэрт, пераможца якога і стане нашым прадстаўніком на еўравізійным шоу талентаў, пройдзе да 8 сакавіка.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ЦІ ПАТРЭБНА ДАРОГА НА АЛЬМАНСКІХ БАЛОТАХ?

Будаўніцтва дарогі ў Альманскіх балотах выклікала негатыўную рэакцыю абаронцаў прыроды. У першую чаргу яны адзначалі, што яе наяўнасць прывядзе да высечкі лесу.

Аднак, па словах **начальніка ўпраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Мікалая СВІДЗІНСКАГА**, той лес не падыходзіць для прамысловага выкарыстання, адпаведна, няма сэнсу ў яго нарыхтоўцы.

«Дарога ў Альманскіх балотах патрэбна і для таго, каб выратаваць балота», — сказаў Мікалай Свідзінскі на прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры.

Будаўніцтва дарогі, на думку спецыяліста, гарантуе бяспеку асабліва ахоўнай прыроднай тэрыторыі, у прыватнасці ў выпадку пажару тэхніка МНС не пройдзе па твані. А пажары на гэтай тэрыторыі ўзнікаюць часцей за ўсё па віне наведвальнікаў, якія займаюцца нарыхтоўкай ягад. «Калі б Альманскія балоты працягвалі гарэць да зімы, да ўстойлівага снегавога покрыва, як гэта было раней, мы атрымалі б загінулую экасістэму, якая аднаўлялася б не адну сотню гадоў», — растлумачыў Мікалай Свідзінскі.

Ён паведаміў, што былі выяўлены парушэнні падчас будаўніцтва дарогі, у прыватнасці несанкцыянаванае выкарыстанне пяску, за што і былі пакараны вінаватыя. Прадстаўнік Мінпрыроды адзначыў важную ролю грамадскіх арганізацый АПБ і «Багна», якія выявілі факты парушэнняў.

Цяпер будаўніцтва дарогі працягваецца «па варыянце, які прайшоў дзяржаўную экалагічную экспертызу».

Аксана ЯНОЎСКАЯ.

Крымінал

БРАЛІ ХАБАР У СТУДЭНТАЎ

Як паведамілі ва ўпраўленні Следчага камітэта па Брэсцкай вобласці, намеснік дырэктара і тры выкладчыкі адной з сярэдніх спецыяльных навучальных установ Пінска ў студзені бягучага года атрымлівалі ад студэнтаў грашовыя сродкі і падарункавыя сертыфікаты магазінаў за паспяховую здачу экзаменаў.

Супрацьпраўныя дзеянні падазраваных былі выяўлены супрацоўнікамі АБЭЗ Пінскага ГАУС.

Зараз у дачыненні да кожнага з іх Пінскім міжраённым аддзелам Следчага камітэта заведзена крымінальная справа па ч. 1 арт. 430 (атрыманне хабару) Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Праваахоўнікі праводзяць неабходныя следчыя і іншыя працэсуальныя дзеянні.

Акрамя таго, у рамках расследавання крымінальнай справы ўстанаўліваюцца прычыны і ўмовы, якія спрыялі здзяйсненню названых злачынстваў.

Сяргей КУЛАКОЎ.

Факт

ПАВЯЛІЧЫЛІ «ЗЯЛЁНЫЯ ЛЁГКІЯ» КРАІНЫ

Амаль 35 тысяч гектараў новых лясоў стварылі лесаводы ў 2018 годзе, паведамілі ў Мінлясгасе.

У 2018 годзе лясгасы за кошт стварэння лясных культур заклалі 34,8 тысячы гектараў новых лясоў. Гэта на 10,3 % больш за запланаваны аб'ём. Найбольш актыўна пасадка лесу вялася ў Гомельскай вобласці: тут было створана больш за 11,1 тысячы гектараў лясных культур. У агульным аб'ёме створаных насаджэнняў 96,7 % (33 645 гектараў) складаюць хваёвыя і цвёрдаліставыя пароды (хвоя, елка і інш.). Яшчэ 3,3 % (1157 гектараў) прыпадае на мяккаліставыя пароды (бяроза, алешына і інш.). Пры гэтым больш за палову лясных культур — 18 709 гектараў — былі створаны з выкарыстаннем селекцыйнага пасадачнага і пасяўнога матэрыялаў.

Перавыкананне устаноўленых планаў стварэння лясных культур абумоўлена перш за ўсё неабходнасцю правядзення работ па лесаадноўленні на ўчастках распрацаваных усохлых насаджэнняў хваёвых парод і ветравальна-бураломных высечак. Так, лясныя культуры на ўчастках распрацаваных усохлых насаджэнняў хваёвых парод былі створаны на плошчы 20 982 гектары, на ветравальна-бураломных участках сяўба і пасадка выкананы на плошчы 844 гектары.

Усяго ж у 2018 годзе арганізацыямі сістэмы Мінлясгаса мерапрыемствы па лесаадноўленні і лесаразвядзенні былі праведзены на плошчы звыш 41,2 тысячы гектараў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ОАО «Стройтрест № 7» сообщает о проведении внеочередного общего собрания акционеров

Собрание состоится 28 февраля 2019 года в администрации здания ОАО «Стройтрест № 7» (г. Минск, пр-т Машерова,16, зал заседаний) в 15.00. Регистрация участников собрания с 14.00 до 14.45 по месту проведения собрания.

ПОВЕСТКА ДНЯ

О внесении изменений в устав Общества.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться с 8 февраля 2019 по 27 февраля 2019 года (в рабочие дни) по месту нахождения общества (пр-т Машерова, 16, тел.: 288-17-41, 288-14-49). Список акционеров для регистрации будет определен по состоянию на 30 января 2019 г.

Для регистрации иметь при себе следующие документы:
акционеру общества – паспорт;
представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 100512859

Утерянные квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии СВ 0652371 – 0652390 страховой компании «Промтрансинвест» считать недействительными.

В суд Волковысского района поступило заявление о признании безвестно отсутствующим Кухты Николая Александровича, 25 марта 1971 года рождения, уроженца г. Волковыска Гродненской области, последнее известное место жительства которого: Гродненская область, Волковысский район, д. Студенец, ул. Родниковая, 61, место нахождения которого неизвестно, с просьбой ко всем гражданам и юридическим лицам, имеющим сведения о Кухте Николае Александровиче, сообщить их суду Волковысского района в течение двух месяцев с момента публикации

За межамі мегаполіса, але побач з ім

За круглым сталом.

Фота Андрэя САЗОНАВА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Самая вялікая праблема — у комплексным развіцці тэрыторыі гарадоў-спадарожнікаў. Так, напэўна, ні для кога не сакрэт, што ў нас у першую чаргу адстае сацыяльны складнік, — расказаў **намеснік старшыні камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Мінаблвыканкама, галоўны архітэктар Мінскай вобласці Вадзім НІКАЛАЕНКА.** — Паколькі развіваем гарады-спадарожнікі для вырашэння жыллёвай праблемы мінчан, то тут адназначна неабходна падключацца Мінску і ўкладвацца ў гэта.

Вадзім Нікалаенка расказаў, што ў Мінскай вобласці каля паўтара мільёна жыхароў, з іх 90 тысяч чалавек маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. У раёнах не хапае дзіцячых садкоў і школ, напрыклад, у Мінскім раёне не хапае 14 садкоў. Сёння развіццё гарадоў-спадарожнікаў знаходзіцца ў ступары, бо бюджэт Мінаблвыканкама не можа фінансаваць і будаўніцтва жылля, і інфраструктуру.

Спецыялісты лічаць, што для людзей сёння важнае не толькі набыццё кватэры, але і набыццё зручнага асяроддзя.

— Горадабудаўнічая дзейнасць дае магчымасць асвойваць тэрыторыі, — лічыць **дырэктар Беларускага навукова-даследчага і праектнага інстытута горадабудаўніцтва Аляксандр ХІЖНЯК.** — Аднак сучасны рынак патрабуе новых падыходаў. Патэнцыйныя пакупнікі хочуць зручнае знаходжанне свайго жылля, добрую планіроўку і від дома, дзіцячую пляцоўку і абавязкова дзіцячыя садкі, школы і паліклінікі, а таксама дастатковую колькасць гандлёвых аб'ектаў. Таму развіццё рэгіёна залежыць ад развіцця інфраструктуры і наяўнасці працы.

Для развіцця раёна неабходна дапамагаць маладым спецыялістам будаваць свой уласны дом. Такую думку выказала **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, дырэктар ААТ «Азярыцкі-Агра» Ніна ЖАЛЯЗНОВА.**

— Мы будуем жыллё за кошт крэдытаў прадпрыемства, — расказала сенатар. — Першыя сем гадоў яно лічыцца службовым, і толькі потым спецыяліст мае магчымасць выкупіць яго. Калі ж чалавек будзе мець магчымасць адразу пабудаваць уласны дом, зрабіць там рамонт і пасадзіць сад, то яму ўжо будзе цяжка пакінуць сваю малую радзіму. Таму мая прапанова: выдзяляць ільготны крэдыт для сям'і спецыяліста, які прыходзіць да нас працаваць. Гэта неабходна, каб замацаваць людзей на гэтай зямлі, каб маладыя людзі, якія набраліся ў нас вопыту, не пакідалі сваю гаспадарку.

За круглым сталом абмяркоўваліся і праблемы інвестараў, якія набываюць пляцоўкі для будоўлі. Але апошнія з-за адсутнасці інфраструктуры непрыгодныя для рэалізацыі задуманага. Гэтая акалічнасць стрымлівае інвестарскую актыўнасць. Удзельнікі абмеркавання казалі, што неабходна ствараць паўнавартасныя інвестыцыйныя пляцоўкі, на якія б маглі прыходзіць інвестары са сваімі праектамі. Каб развіваць рэгіён разам з бізнесам, а не толькі за кошт бюджэту, трэба пераходзіць да больш гнуткага горадабудаўнічага планавання.

Старшыня Смалявіцкага райвыканкама Міхаіл ЗАГОРЦАЎ прапанаваў стварыць асобную інвестыцыйную праграму для развіцця гарадоў-спадарожнікаў, бо на сённяшні дзень у Смалявічы пераехала толькі 148 сем'яў з Мінска, а далейшае будаўніцтва жылля замарожана з-за адсутнасці неабходнай інфраструктуры. Таксама старшыня райвыканкама лічыць, што ўвагу трэба ўдзяліць і прыцягненню людзей на працу ў Смалявіцкі раён.

— Толькі ў індустрыяльным парку «Вялікі камень» плануецца стварыць 3,5 тысячы рабочых месцаў, — падкрэсліў Міхаіл Загорцаў. — Нам ужо зараз трэба займацца стварэннем прывабных умоў для гэтых людзей.

Развіццё гарадоў-спадарожнікаў дапамагло б не толькі вырашыць праблемы перанаселенасці сталіцы, развіцця рэгіёнаў, але і нарадзіла б своеасаблівы будаўнічы бум, а значыць, і выхад з крызісу ў гэтай галіне (або адзін з іх) быў бы знойдзены. У жыцці за межамі мегаполіса, але побач з ім, ёсць свае значныя перавагі.

Нагадаем, нядаўна Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка на нарадзе з актывам сталіцы раскрытыкаваў тэмпы рэалізацыі праграмы па развіцці гарадоў-спадарожнікаў Мінска. Лідар Беларусі лічыць, што гарады-спадарожнікі і індустрыяльны парк — гэта вектары развіцця і разгрузкі сталіцы.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.
Смалявіцкі раён.

Турызм

ЗАДАЧКІ НА БУДУЧЫНЮ,

або Ці гатова Беларусь да наплыву замежнікаў?

Бязвізавы рэжым пачаў даваць нядрэнныя вынікі: экспарт турпаслуг за мінулы год павялічыўся на 13—14 працэнтаў. Як паведаміў намеснік дырэктара Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Віталь ГРЫЦЭВІЧ, летась заходне-паўднёвую мяжу Беларусі перасекла 4,7 мільёна замежных гасцей. Наогул жа краіну наведала больш за 12 мільёнаў чалавек.

ЗАПРАШАЕМ НА ЗАВОД

Натуральна, найчасцей нас адорваюць увагай турысты з Расіі. Сярэдні час іх знаходжання ў «сінявокай» складае каля пяці дзён. Але пачала прырастаць колькасць падарожнікаў з Прыбалтыкі і Польшчы, а таксама больш аддаленых краін. Карыстаюцца папулярнасцю туры выхаднога дня, прычым госці едуць не толькі паглядзець на беларускую архітэктуру і прыроду — запатрабаваны і прамысловы турызм. Адзін з самых раскручаных тураў — на БелАЗ. Плануецца надалей развіваць гэтую галіну. Але найперш трэба вырашыць праблему з прафесійнай падрыхтоўкай спецыялістаў, якія будуць вадзіць турыстаў па прадпрыемствах. Справа ў тым, што «левых» людзей дапускаць на вытворчасць нельга, а супрацоўнікам фабрык і заводаў часам не хапае ведаў, як працаваць з падарожнікамі.

Паступова інфраструктура перастройваецца пад новыя запатрабаванні рынку. Напрыклад, на Брэстчыне, у раёнах, дзе дзейнічае бязвізавы рэжым, летась з'явілася 37 новых аграсядзіб. У меню рэстаранаў можна ўбачыць інфармацыю на літоўскай і польскай мовах. Недалёка ад Белавежскай пушчы будуецца аграгурыстычны комплекс, які зможа прыняць звыш 130 гасцей.

Віталь Грыцэвіч адзначыў, што разглядаецца пытанне аб аб'яднанні гродзенскай і брэсцкай бязвізавых зон, што дазволіць затрымаць турыста на нашай тэрыторыі на больш працяглы час. Так, сёння замежнікі ў сярэднім праводзяць у Беларусі каля двух дзён, але ў будучым з пашырэннем даступных для наведвання без віз тэрыторый ён зможа выпраўляцца па новых маршрутах.

Прырастае колькасць турыстаў у тым ліку і дзякуючы разнастайным міжнародным мерапрыемствам. Толькі за мінулы год у нас было праведзена больш за 70 буйных спартыўных спаборніцтваў. Ужо сёння можна запісацца на новую экскурсію «Мінск — спартыўны» і больш даведацца пра аб'екты, якія будуць задзейнічаны падчас II Еўрапейскіх гульняў.

БЕЛАВЕЖСКАЯ ПУШЧА СУПРАЦЬ ВЯЛІКАГА УСЦЮГА

Сёння трэба паклапаціцца пра падрыхтоўку спецыялістаў для розных галін, якія змогуць абслугоўваць замежных турыстаў. Так, калі з англамоўнымі экскурсаводамі справа больш-менш вырашана, то гідаў, якія валодаюць арганізатарскімі якасцямі і здольныя аператыўна вырашаць разнастайныя праблемы, пакуль не хапае. Персанал з веданнем моў спатрэбіцца ў гасцініцах, пунктах харчавання. Неабходныя кіроўцы, здольныя разумець замежнікаў, а таксама «палявыя інструктары», да якіх будуць звяртацца аматары актыўнага адпачынку (напрыклад, велападарожжаў і байдарак).

Неабходна ўлічваць і сезонныя наплывы турыстаў. Напрыклад, Мінск прызналі адным з найлепшых месцаў для навагодніх канікул. Гасцініцы былі загружаны больш чым на 70 працэнтаў. Вось і задачка на будучыню не толькі для гарадскога кіраўніцтва, але і прадстаўнікоў бізнесу: як скарыстаць такую папулярнасць і які прадукт стварыць на наступны навагодні сезон.

Гарачымі выдаліся Каляды і для Белавежскай пушчы. Мясцовы Дзед Мароз аказаўся нават больш запатрабаваны за расійскага ў Вялікім Усцюгу і быў прызнаны самым папулярным казачным персанажам у краінах СНД. Між іншым, такая слава дабавіла турбот беларускаму чароўнаму дзеду: ён ледзьве спраўляўся з «нашэсцем» турыстаў. На працягу толькі аднаго дня ў канцы снежня да яго прыехала больш за 140 аўтобусаў!

Наогул, у параўнанні з леташнімі святамі, колькасць гасцей у Беларусі павялічылася амаль у паўтара раза.

Фота Ліны МАЛІННАЙ.

СТАЎКА НА СПА І СУМЕСНЫЯ МАРШРУТЫ

Пакуль у Беларусі не так многа кампаній, якія займаюцца экспартам турпаслуг. На далёкіх рынках працаваць надта дорага, цяжка прадаць свой прадукт, бо канкурэнцыя вельмі вялікая. Да таго ж не хапае спецыялістаў, знаёмых з сучаснай сістэмай страхавання, анлайн-браніравання, апрацоўкі дакументацыі.

Але пэўныя захады робяцца. Як паведаміў **старшыня праўлення Рэспубліканскага саюза турыстычнай індустрыі Філіп ГУЛЫ,** летась пра Беларусь турыстычную было заяўлена нават далёка ў свеце — у Амерыцы, Аб'яднаных Арабскіх Эміратах, Індыі. Штуршком для развіцця міжнароднага турызму маглі б паслужыць сумесныя расійска-беларускія маршруты. Напрыклад, у кітайцаў запатрабаваны напрамак Мінск — Масква — Санкт-Пецярбург. Ёсць цікавасць да такіх падарожжаў і ў гасцей з Захаду. Сёлета беларускі і расійскі саюзы туріндустрыі былі прынятыя ў Еўрапейскую экскурсійную асацыяцыю, а значыць, цераз нашу тэрыторыю праз некаторы час пачнуць ездзіць аўтобусы з вялікімі арганізаванымі ці зборнымі групамі замежных турыстаў.

Сярод планаў на будучыню — «амаладжэнне» кантынгенту санаторыяў. Каб завабіць з СНД людзей ва ўзросце 30—55 гадоў, давядзецца ўкладаць у санаторыі новыя рэсурсы, рабіць стаўку на аздараўленне, спа-працэдуры і дыягностыку.

Паколькі турыстычныя паслугі амаль нідзе не крэдытуюцца, разглядаецца пытанне аб стварэнні фінансава-крэдытнага цэнтра, які будзе падтрымліваць гэту галіну.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Сямейная газета

Выпуск № 2 (117)

Пра карысць маўчання

– Святы айцец, вы ж ведаеце, як гэта працуе?
– Тэарэтычна...
(Фільм «Пяты элемент».)

Колькі разоў вам даводзілася чуць (а мо, і самім выказваць?) нараканні: урачы дрэнна лечаць, выпісваюць накіраванні на непатрэбныя аналізы і прызначаюць «фуфламіцыны», школа дрэнна вучыць, бо ў настаўнікі ідуць адно тыя, хто больш нікуды не паступіў, новае жыллё дрэнна будуюць, бо ўсё навокал крадуць і робяць цяп-ляп, па тэлевізары абышто паказваюць, бо што яны там умеюць, гэтыя страшна далёкія ад народа «гаворачыя галовы», а ўжо як жахліва выхоўваюць новае інфантыльнае пакаленне сучасныя бацькі — ні злосці, не слоў на іх не хапае.

Зрэшты, слоў якраз хапае, а таму з усіх бакоў людзі даюць адно аднаму няпрошаныя парады, робяць бестактоўныя заўвагі, вучаць жыццю, крытыкуюць і скардзяцца, патрабуюць прыцягнуць да адказнасці, змешваючы ў адзін вінегрэт свае і чужыя правы і абавязкі. Прычым часта самыя гучныя і безапеляцыйныя заўвагі робяць тыя, хто ў прадмеце разбіраецца, мякка кажучы, зусім па вярхах, тэарэтычна. Мы — грамадства тэарэтыкаў і экспертаў з канапы, якія лепш за прафесіяналаў у той ці іншай справе ведаюць, як правільна трэба вучыць, лячыць, жаніцца, разводзіцца, выхоўваць дзяцей, вадзіць машыну. Так-так, і пісаць артыкулы можам не горш за іншых. Ат, што тут цяжкага, некалькі слоў у сказ скласці, усе пісьменныя, у школе сачыненні здавалі — а якія там былі ацэнкі за змест і арфаграфію, не мае ніякага значэння, бо... (гл. пункт пра настаўнікаў). Словам, мы з вамі, прыклаўшы элементарныя высілкі і ўключыўшы напоўніцу свае разумовыя здольнасці і шматлікія таленты, ужо заўтра змаглі б служыць у разведцы, здымацца ў кіно, атрымаць Вялікі хрустальны глобус на чэмпіянаце свету па біятлоне і выйграць «Еўрабачанне». Тэарэтычна. А на практыцы да ікоты часта згаданыя ўрачы самых розных спецыяльнасцяў рэгулярна змагаюцца з наступствамі самалячэння асабліва разумных пацыентаў, якія «па інтэрнэце» сабе і дыягназ паставілі, і лекавыя сродкі прапісалі, а педагогі разводзяць рукамі: якіх поспехаў у вучобе патрабаваць ад дзіцяці, калі яго мама пастаянна пытаецца ў класным чаце: *«Что зодовали назавтра?»*

Альбо вось узяць новы стары прадмет «Асновы сямейнага жыцця», які ў выглядзе факультатыву вяртаецца ў беларускія школы. З аднаго боку, бацькі абедзвюма рукамі «за», бо інстытут сям'і, як ніколі, мае патрэбу ў падтрымцы, а то і ў паратунку. А з другога — у інтэрнэт-суполках горача спрачаюцца: хто, уласна, будзе выкладаць старшакласнікам такі важны прадмет — школьны псіхолаг Мар'я Іванаўна, у якой сваёй сям'і няма ці ёсць негатыўны вопыт? Чаму ўсе так прычапіліся да гэтай міфічнай Мар'і Іванаўны і вырашылі, што яна абавязкова няўдачніца, я не ведаю. Затое бачу з боку тэарэтыкаў шмат крытыкі і сумневаў і пры тым нежаданне падзяліцца ўласным практычным досведам — маўляў, а чаго я, няхай вунь псіхолагі і сацыёлагі, і медыкі, і хто там яшчэ — карацей, хтонебудзь іншы прыйдзе і выхавае ідэальнага будучага сем'яніна. Хоць справа якраз не ў ідэале, а ў тым, каб падлеткі зразумелі, што тэорыя нішто без практыкі, без штодзённай працы, у тым ліку над сабой...

Зноў жа, на практыцы назіраецца дзіўная рэч. Мала хто з нас ведае і разумее механізмы ўласнай псіхікі, але практычна кожны дарослы чалавек збольшага ўяўляе сабе, як уладкаваны, прабачце, зліўны бачок ва ўнітазе. І прытым чамусьці ніхто не лезе з каштоўнымі парадамі пад руку сантэхніку, які прыйшоў ратаваць вашага «белага сябра». Затое тэарэтыкі дружным хорам скажуць вам, што найлепшы сродак ад дэпрэсіі — гэта перастаць ныць (а пасляродавай дэпрэсіі наогул не існуе, яе лянівыя мамкі выдумалі, каб дома з дзецьмі не сядзець, ага). Атрымліваецца — чалавечая душа больш простая рэч, чым унітаз? Альбо проста ад сантэхніка з вялікай доляй верагоднасці прыляціць у адказ парада, куды б вам пайсці са сваімі парадамі?

Напэўна, тут важна ўсвядоміць і прыняць: калі ты можаш дапамагчы і зрабіць лепш, то проста зрабі і ідзі далей. А калі не можаш і парады не просяць, то збяры ўсе сілы і прайдзі моўчкі, без маралі і павучэнняў. Гэта якраз той выпадак, калі маўчанне — золата. І плюсік у карму.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Тыя, хто побач

«Калі мужчыны даюць волю пачуццям, гэта прыгожа»

Разам з сынам Оскарам.

«Неяк сяброўка папрасіла аформіць радзільню. Частку фатаграфій мы развесілі ў аддзяленні паталогіі цяжарнасці. І мамы пачалі пісаць лісты, што, калі б не гэтыя здымкі, то з'явілася б жаданне накласці на сябе рукі. Тады ўнутры нешта ўздрыганулася. І я зразумела, што фатаграфія можа больш, чым проста быць прыгожай карцінкай», — успамінае Наталля МІРАНЧУК, кіраўнік сацыяльна-дабрачыннай установы «Бэйбі Сторы». Яна арганізуе здымкі немаўлят і выстаўкі, якія лепш за любую сацыяльную рэкламу паказваюць, якое гэта шчасце — мець сям'ю. А таксама дапамагае неданошаным дзецям і збірае жанчын на майстар-класы для будучых мам. Чаму нованароджаных фатаграфуюць спячымі, навошта падчас здымкі ўключаюць «гул самалёта», за што варта дзякаваць мужчынам і што дае мацярынства, Наталля расказала ў інтэрв'ю «Сямейнай газеце».

(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)

Нашы дзеці

АДАБРАЦЬ ЦІ ПАКІНУЦЬ?

Пра расследаванне педагогаў, урачоў-экспертаў і сацпаслугі для бацькоў

З заўтрашняга дня прызнаваць дзяцей тымі, якія апынуліся ў сацыяльна небяспечным становішчы (СНС), будуць па новых крытэрыях, вызначаных пастановай Саўміна № 22 ад 15 студзеня 2019 г. Дзякуючы зменам цяперашняе знаходжанне 24 тысяч дзяцей у СНС да 1 жніўня перагледзяць, і, як спадзяюцца спецыялісты, многія пазбавяцца такога азначэння і адпаведна — кантролю за сям'ёй.

15 дзён на праверку

Пад сацыяльна небяспечным становішчам непаўналетніх разумеюць сітуацыі, калі малыя знаходзяцца ў абставінах, пры якіх не задавальняюцца іх асноўныя жыццёвыя патрэбы. Гэта значыць, бацькі не гарантуюць ім бяспеку, нагляд і клопат, у дзяцей адсутнічаюць ежа, адзенне, жыллё, медыцынская дапамога. Як вынік, непаўналетнія здзяйсняюць правапарушэнні і злачынствы. Да прыкмет СНС адносіцца таксама амаральны лад жыцця бацькоў, іх негатыўны ўплыў на дзяцей і фізічны гвалт, што стварае небяспеку для жыцця і здароўя малых.

Інструкцыя № 47 ад 2004 года Міністэрства адукацыі не ўлічвала нормаў многіх заканадаўчых актаў, што былі прынятыя пазней, таму патрабавала перагляду, адзначыла **Алена СІМАКОВА, галоўны спецыяліст упраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі:**

— Малыя прызнаюцца тымі, якія апынуліся ў СНС толькі тады, калі бацькі не выконваюць свае абавязкі належным чынам, чым ствараюць неспрыяльны для дзяцей асяродак і небяспеку іх жыццю і здароўю. У пастанове № 22 раскрываюцца парадак і тэрміны выяўлення дзяцей у СНС і нязручных для іх абставін як першага кроку да вызначэння наяўнасці сацыяльна небяспечнага становішча ў сям'і.

(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)

АДАБРАЦЬ ЦІ ПАКІНУЦЬ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Калі нездаровыя прыкметы знойдуцца, адпаведны дакумент накіруюць у органы адукацыі, дзе яго вывучаць і прааналізуюць, аднак гэта не азначае аўтаматычнага прысваення сям'і статусу СНС. Педагогі павінны адрэагаваць на сігнал і правесці «сацыяльнае расследаванне» — такое дзеянне як тэрмін упершыню замацавалі заканадаўча ў пастанове № 22. Абстаноўку ў сям'і павінны праверыць цягам 15 дзён.

Жаданне выправіцца вітаецца

Расследаваннем будуць займацца не адны толькі педагогі, а і іншыя органы, што павінны абараняць правы і інтарэсы дзяцей. Вынікі расследавання разгледзяць на пасяджэнні савета ўстановы адукацыі па прафілактыцы злачынстваў і правапарушэнняў непаўналетніх, каб вынесці вердыкт пра наяўнасць сацыяльна небяспечных крытэрыяў.

Пры гэтым на пасяджэнне абавязкова запросяць бацькоў, каб яны не толькі ведалі, але і чулі, што адбываецца ў дачыненні да іх сям'і. І тут ужо ім вырашаць: ці прымаць меры па выпраўленні, ці не мяняць сваё стаўленне да жыцця і дзяцей.

— У многім зыходзячы з жадання і адказу бацькоў савет прафілактыкі вырашае: накіраваць матэрыялы аб прызнанні дзіцяці тым, якое апынулася ў СНС, у каардынацыйны савет, створаны выканкамам у кожнай мясцовасці, або накіраваць бацькоў па аказанне сацыяльнай дапамогі ў адпаведны дзяржорган, — заўважыла Алена Сімакова. — Пры гэтым бацькі павінны самі напісаць заяву ў дзяржаўны орган, які аказвае сацыяльныя паслугі, каб атрымаць іх. Гэта таксама новая магчымасць, замацаваная заканадаўча для бацькоў, якія жадаюць праявіць актыўную жыццёвую пазіцыю і гатоўнасць стварыць для дзіцяці нармальныя ўмовы жыцця. Такім чынам яны ўжо прымаюць меры, каб іх сям'ю не прызналі ў СНС.

Другая магчымасць самастойна вырашыць, выпраўляцца ці не, даецца бацькам падчас пасяджэння каардынацыйнага савета — там прымаецца рашэнне аб замацаванні за малымі статусу СНС і зацвярджэнні комплексу мерапрыемстваў, скіраваных на стварэнне спрыяльнага асяродку для дзяцей. Праўда, пры гэтым у сям'і будуць праходзіць таксама і кантрольныя мерапрыемствы.

Уся гэтая работа датычыцца выпадкаў, **калі дзіця пакідаюць у сям'і і не прызнаюць яго тым, каму патрабуецца абарона дзяржавы.** Новая пастанова скіравана менавіта на ўдасканаленне работы без адабрання малых з сем'яў.

— Больш дакладная, ясная, зразумелая, з пэўна вызначаным парадкам работа на этапе прызнання дзяцей тымі, якія апынуліся ў СНС, дазволіць зрабіць адабранне малых з сям'і мінімальным, — дадала прадстаўніца міністэрства адукацыі. — Па даных на канец мінулага года, дарэчы, у параўнанні з 2010-м удвая зменшылася колькасць дзяцей, бацькі якіх пазбаўлены правоў на малых.

Медыцынскія крытэрыі

Пры распрацоўцы пастановы № 22 улічваліся таксама факты неабгрунтаванага прызнання дзяцей тымі, якія апынуліся ў СНС, і тымі, каму патрабуецца абарона дзяржавы, у тым ліку і на падставе заключэнняў урачэбных камісій.

— На месцах не заўжды правільна трактавалася Інструкцыя № 47, якой кіраваліся таксама і супрацоўнікі аховы здароўя пры выяўленні прыкмет СНС, — заўважыла **Ганна КОТАВА, галоўны пазаштатны спецыяліст Міністэрства аховы здароўя па амбулаторна-клінічнай дапамозе дзецям.** — Нашы работнікі пры аказанні дапамогі дома звярталі ўвагу на сямейна-бытавыя ўмовы, якія маглі сведчыць пра існаванне патэнцыйна дрэннага становішча для цяжарнасці або жыцця і здароўя непаўналетняга.

Пастанова № 22 дакладна вызначыла крытэрыі, па якіх цяпер павінны працаваць медыкі, — гэта калі бацькі сістэматычна не выконваюць рэкамендацыі медработнікаў па дыягностыцы, лячэнні або рэабілітацыі дзіцяці, што пагражае яго жыццю ці здароўю.

— Новая роля з'явіцца ва ўрача-педыятра і тэрапеўта — функцыя ўрача-эксперта, які павінен будзе вызначыць наяўнасць пагрозы жыццю і здароўю дзіцяці, — дадала яна. — Пры гэтым з 24 тысяч дзяцей у СНС 1913 малых было выяўлена медыкамі, а ўсяго з боку ўрачоў было даслана больш як 9000 рэагаванняў.

Трэба адрозніваць, што сістэматычнае адмаўленне ад антыбіётыкаў пры прастудах — не падстава для

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

рэагавання, а вось адмова ад іх пры пнеўманіі — крок да СНС. Поўнае непрыманне прышчэпак, якія адносяцца да прафілактычных мер, таксама не прывядзе да прызнання дзіцяці тым, якое знаходзіцца ў небяспецы.

Накіраванне ў ЛПП і праверка настрою

Роля праваахоўных органаў пры выяўленні дзяцей, якія трапілі ў сацыяльна небяспечнае становішча, цяпер будзе жорстка вызначана і звядзецца да прафілактычнай работы з бацькамі, калі яны стаяць на прафілактычным уліку, і непаўналетнімі, калі на тое маюцца заканадаўчыя падставы. А таксама пры разглядзе скаргаў ад суседзяў.

— Інфармацыя ад органаў унутраных спраў ці аховы здароўя ў органы адукацыі аб наяўнасці тых ці іншых крытэрыяў не з'яўляецца падставай для пастаноўкі дзіцяці ў СНС. Гэта суб'ектыўнае меркаванне таго, хто выявіў даныя крытэрыі. Рашэнне будзе прымацца ўпаўнаважаным на тое органам, — падкрэсліў **Сяргей ЯНКОЎСКІ, начальнік аддзела ўпраўлення прафілактыкі Міністэрства ўнутраных спраў.** — Органы ўнутраных спраў у межах сваёй кампетэнцыі будуць праводзіць індывідуальную прафілактычную работу з асобамі, якія апынуліся ў СНС, або афармляць у лячэбна-працоўны прафілакторый пры наяўнасці падставы для гэтага.

У сваю чаргу, спецыялісты Міністэрства працы і сацыяльнай абароны насельніцтва выяўляюць дзяцей, што апынуліся ў сацыяльна небяспечным становішчы, падчас гутарак з людзьмі, якія звяртаюцца да іх: пры аказанні сацыяльных паслуг дома, назначэнні сацыяльнай, адраснай дапамогі, пенсій, абследаванні ўмоў пражывання, выдачы пасведчання шматдзетнай сям'і. Аналізуюць настрой, паводзіны і стасункі бацькоў і дзяцей і робяць адпаведныя вывады.

Ірына СІДАРОК.

Сацыяльная кансультацыя

Як атрымаць тэхнічныя сродкі рэабілітацыі?

У Беларусі пражывае больш за 568 тысяч людзей з інваліднасцю, з іх амаль 32 тысячы складаюць дзеці да 18 гадоў. Многія з гэтых людзей маюць патрэбу ў тэхнічных сродках рэабілітацыі. Якім чынам іх можна атрымаць і ці маюцца льготы па іх аплаце, нам расказалі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.

Пратэзна-артапедычныя і іншыя сродкі рэабілітацыі значна аблягчаюць жыццё людзям з абмежаванымі магчымасцямі. Усяго ў Дзяржаўны рэестр тэхнічных сродкаў сацыяльнай рэабілітацыі ўваходзяць 72 пазіцыі — крэсла-каляска з электрапрыводам, апорны кій, спецыяльны супрацьпролежневы матрац, пратэзы верхніх і ніжніх канечнасцяў, бандажныя вырабы, слыхавыя апараты і многія іншыя прадметы. Забеспячэнне імі людзей, якія маюць такую патрэбу, праводзіцца па заяўным прынцыпе.

КУДЫ ЗВЯРТАЦЦА?

Патрэбу ў тэхнічных сродках рэабілітацыі для чалавека вызначае медыка-рэабілітацыйная экспертная камісія (МРЭК) альбо ўрачэбна-кансультатыўная камісія (УКК).

Для забеспячэння сродкамі рэабілітацыі неабходна звярнуцца з заявай у мясцовы орган па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, прадставіўшы наступныя дакументы:

— індывідуальную праграму рэабілітацыі альбо заключэнне УКК;

— дакумент, які сведчыць асобу;

— пасведчанне аб нараджэнні дзіцяці і пашпарт аднаго з бацькоў пры забеспячэнні сродкамі рэабілітацыі дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 16 гадоў;

— пасведчанне (укладыш да яго) для грамадзян, якія маюць права на льготы;

— працоўную кніжку (пры неабходнасці).

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Дарэчы, не ўсе сродкі рэабілітацыі можна атрымаць у органах сацыяльнай абароны. Па мыліцы, пратэзы і артэзы верхніх і ніжніх канечнасцяў і тулава, экзапратэзы малочнай залозы з ліфамі, артапедычны абутак і некаторыя іншыя сродкі рэабілітацыі прыйдзецца звяртацца ў Беларускі пратэзна-артапедычны аднаўленчы цэнтр у Мінску ці ў яго філіялы ў рэгіёнах.

Каб людзям з інваліднасцю I, II групы і дзецям-інвалідам выдзелілі слыхавыя апараты, кантактныя лінзы, лупы, тэст-палоскі для вызначэння ўзроўню цукру ў крыві, глюкометр ці інсулінавыя шпрыцы, неабходна звяртацца ў мясцовыя органы аховы здароўя.

Бываюць выпадкі, калі інваліду складана самастойна прыехаць і падаць дакументы. За яго гэта могуць зрабіць сваякі. А на дом да адзінокага чалавека можа быць накіраваны сацыяльны работнік, які прыме заяву. Акрамя таго, інваліды I групы і інваліды-калясачнікі для атрымання сродкаў рэабілітацыі маюць права бясплатна скарыстацца сацыяльным таксі.

ШТО НАКОНТ АПЛАТЫ?

Сродкі рэабілітацыі могуць выдзяляцца бясплатна, а таксама на льготных умовах — з аплатай 20, 25 і 50 працэнтаў кошту. Таксама маюцца пэўныя катэгорыі грамадзян, якія павінны набываць сродкі рэабілітацыі за поўны кошт у арганізацыі-вытворцы або ў арганізацыі, якая гандлюе імі. Умовы аплаты ў кожным канкрэтным выпадку лепш удакладніць у раённым упраўленні па працы, занятасці і сацыяльнай абароне (у сталіцы — у раённым упраўленні сацыяльнай абароны).

ТЭРМІН ВЫКАРЫСТАННЯ

Важна памятаць, што сродкі тэхнічнай рэабілітацыі маюць свой тэрмін выкарыстання. Так, напрыклад, для пакаёвых калясак гэты тэрмін складае пяць гадоў, для прагулачных — чатыры гады. Для многіх з іх прадугледжана магчымасць рамонту — на працягу года з моманту атрымання забяспечваецца гарантыйны рамонт. Па заканчэнні гэтага тэрміну органы сацыяльнай абароны яшчэ раз бясплатна адрамантуюць сродак тэхнічнай рэабілітацыі.

У выпадку калі тэрмін эксплуатацыі сродку рэабілітацыі не мінуў, але ў чалавека змяніліся антрапаметрычныя параметры, палепшыўся альбо пагоршыўся стан здароўя, у выніку чаго немагчыма выкарыстоўваць наяўны сродак рэабілітацыі, пры наяўнасці індывідуальнай праграмы рэабілітацыі інваліда ці заключэння УКК магчыма выдача новага. Пры гэтым выдадзены раней сродак рэабілітацыі трэба будзе вярнуць.

Святлана БУСЬКО.

Погляд знутры

ВЯСЕЛЬНЫ МАРАФОН

Калі што ні дзень, то «горка!»

Тыя, хто «абвяшчае людзей мужам і жонкай», расказалі пра асаблівасці сваёй працы і падзяліліся назіраннямі наконт сямейнага жыцця.

Жаніхі-гумарысты і майская вернасць

Адзін з самых прыгожых беларускіх аддзелаў ЗАГС знаходзіцца ў Пінску. Шыкоўны палац XVIII стагоддзя ў стылі барока і класіцызму калісьці належаў вядомаму палітычнаму дзеячу Мацею Бутрымовічу і цудоўна захаваўся да нашых дзён. На рэгістрацыю шлюбаў сюды прыязджаюць не толькі пінчане, але і жыхары суседніх раёнаў. Таму і планка ў супрацоўнікаў тут высокая.

— Абавязковыя патрабаванні — вышэйшая юрыдычная адукацыя, артыстызм, адкрытасць, шырокі кругагляд, здольнасць да імправізацыі, — расказвае начальнік аддзела **Алена АМЕЛЬЯНЮК.** — Зразумела, у нас ёсць канкрэтныя супрацоўнікі, за якімі замацавана рэгістрацыя шлюбаў, але ў любы момант кожны з нас можа выйсці на падмену.

Ірына РАГОЗІНА працуе ў Пінскім загсе з 1992 года. Падлічыць, колькі пар ёй давялося распісаць, нерэальна.

— Не здзіўляйцеся, але парадак рэгістрацыі шлюбаў за гэты час амаль не змяніўся. Марш Мендэльсона, роспіс, пярсцёнкі, пацалункі, першы танец, — дзеліцца жанчына. — Усяго цырымонія займае 20—25 хвілін (разам з вяншаваннямі гасцей у асобнай зале). Хтосьці думае, што мы працуем, быццам на канвееры. Гэта не так. Кожная пара — асобны сусвет, які трэба імгненна разгадаць, каб цырымонія прайшла ўдала. Да адных уваходзіш — усе ўсміхаюцца і з нецярпеннем чакаюць тваіх слоў. У іншых — атмасфера напружаная, маладыя паспелі «пацапацца» па дарозе. І тут ужо ад цябе залежыць, якім ім запомніцца момант роспісу.

У кожнага супрацоўніка загса былі моманты ў жыцці, калі здаралася нешта не самае прыемнае, а па плане — рэгістрацыя шлюбаў.

— Ты ўсміхаешся, жадаеш людзям шчасця, а ўнутры плакаць хочацца. Кожны з нас — артыст у некаторым сэнсе слова. Гэта не азначае, што мы кажам няшчыра. Калі бачыш, што жаніх і нявеста ўважліва слухаюць, то хочацца сказаць больш. Цёпла і ад усяго сэрца. Але ёсць і такія пары, якім «да лямпачкі» — дзяўчыны ўсю цырымонію прыхарошваюцца, хлопцы перашэптваюцца з гасцямі, фатографамі, — дзеліцца Ірына Уладзіміраўна. — Форсмажорныя выпадкі таксама здараюцца пастаянна. Нярэдкасць у нас жаніхі-гумарысты — перад тым, як сказаць «Я згодны», маўчаць некалькі секундаў і гэтым самым прымушаюць нявесту панервавацца. Аднойчы ў залу ўвайшла пара. Жаніх шапнуў нешта нявесце, развярнуўся і... сышоў. Я і госці — у шоку. Праз некалькі хвілін падышла яго мама і растлумачыла, што ехалі маладыя доўга, хлопец перахваляваўся і яму трэба супакоіцца.

«На вёсцы можна рэалізаваць самыя смелыя ідэі — прыехаць на цырымонію на кані ці замовіць выступленне цэлага аркестра з мясцовага ДК».

Сёння большасць пар выбіраюць традыцыйныя ўборы — белая сукенка з вэлюмам і цёмны касцюм. Але бываюць і выключэнні.

— Неяк прыехалі маладыя і госці на матацыклах, апранутыя ў скураныя куртакі з заклёпкамі і ланцужкамі. Запомнілася ўсім і нявеста ў ярка-чырвонай сукенцы. Адна з апошніх незвычайных пар была ў традыцыйных народных строях: жаніх у чырвоных ботах, з шырокім поясам, нявеста з вяночкам на галаве, сукенка вышытая, пацеркі бліскучыя.

Што датычыцца самых папулярных вясельных дат, на першым месцы — выхадныя пасля Вялікадня, якія выпадаюць на красавік.

— У такую суботу быў мой першы дзень на рэгістрацыі шлюбаў. Мы распісалі 36 пар. Пасля такога «марафону» два тыдні не размаўляла — зусім асіпла, — прыгадвае сваё «працоўнае хрышчэнне» начальнік аддзела. — А самы насычаны месяц — верасень. Позняй восенню, узімку — ідуць у асноўным пары, якія ў хуткім часе прыйдуць да нас рэгістраваць нараджэнне дзіцяці. Урачыстыя цырымоніі — рэдкасць падчас пастоў і ў маі. Наш народ баіцца і Бога ўгнявіць, і ў забабоны верыць: «У маі жэнішся — век маяцца будзеш».

Цікава, што сама Алена Яўгеньеўна выйшла замуж акурат 9 мая і сваім прыкладам паказвае: прымаўка падманвае. Каб канчаткова разбурыць стэрэатып наконт майскіх шлюбаў, жанчына нават правяла даследаванне. Прааналізавала ўсе майскія шлюбы, пачынаючы з 1940 года, якія заключаліся ў Пінску, і параўнала іх з вераснёўскімі. Аказалася, што другія распадаюцца часцей. Вось і вер пасля такога ў прыкметы.

Па словах Ірыны Уладзіміраўны, меркаваць аб тым, як складзецца сямейнае жыццё пары, можна ўжо ў дзень падачы заявы: «Хлопец усеўся, а нявеста стаіць побач і не ведае, куды прыткнуцца».

— Але не ўсё так адназначна, — лічыць Алена Яўгеньеўна. — Аднойчы мне давялося распісваць неверагодна прыгожую пару. Пяшчота, вочы, поўныя слёз ад радасці, падтрымка і закаханасць у кожным жэсце, позірку і слове. Такія сустракаюцца рэдка. Здавалася, наперадзе іх чакае доўгае сямейнае жыццё ў згодзе і павазе. Аднак усяго праз год яны завіталі да нас зноў — пісаць заяву на развод.

З бляскам золата

У Пінскім загсе захоўваецца незвычайная кніга з фотаздымкамі закаханых пар. Толькі на фота — не маладыя асобы, а людзі, якія перажылі разам многае. Гэтыя сем'і дачакаліся сярэбраных, залатых і нават жалезных вяселляў.

— Дзеці часта робяць падарунак сваім бацькам — замаўляюць цырымонію святкавання ў нас. Але сустракаюцца рамантыкі, якія праз дзясяткі гадоў сумеснага жыцця робяць сюрпрыз сваёй палавінцы, — употайкі арганізоўваюць свята.

Аднойчы на прамую лінію начальніку аддзела ЗАГС патэлефанаваў мужчына:

— У мяне 31 снежня — 50 гадоў сумеснага жыцця з жонкай, залатое вяселле. Хачу даведацца, як склаўся лёс пар, якія пабраліся шлюбам у той дзень разам з намі. Тады, у далёкім 1963 годзе, мы былі першымі ў Пінску, каго зарэгістравалі ва ўрачыстай абстаноўцы. Дагэтуль моладзь проста распісвалася, а нам пашанцавала — музыка, віншаванні ганаровых гасцей, кіраўнікоў партыі, гарвыканкама.

Пасля званка Алена Яўгеньеўна пачала пошукі астатніх пар па сваёй базе, праз міліцыю. З дзевяці сем'яў да залатога юбілею дажылі тры. Дзве распаліся, адна з'ехала, і лёс яе невядомы, дзве жанчыны пахавалі сваіх мужоў, яшчэ адна пара памерла.

— Юбіляраў мы, вядома, запрасілі ў загс і зладзілі для іх свята. Ніхто не чакаў, што праз столькі гадоў ім давядзецца сустрэцца зноў, нехай і не ў поўным складзе. Яны расказвалі пра жыццё, поўнае падзей і выпрабаванняў, успаміналі той самы дзень, калі сталі сем'ямі. Кожны раз распісваючы маладых, хочацца, каб і яны аднойчы вось так маглі зноў прыйсці да нас святкаваць залатое, а лепш брыльянтавае вяселле.

Пад разлівы вясковага аркестра

Атрымаць запаветны штамп у пашпарце можна не толькі ў загсе, але і ў сельвыканкаме. Мясцовыя ўлады гатовыя ўлічыць усе пажаданні маладых і зрабіць сапраўды незвычайную цырымонію.

Галіна ЛАЎРАНЧУК займалася рэгістрацыяй шлюбаў з 1986 да 1993 года, калі была сакратаром сельвыканкама ў вёсцы Лунін (Лунінецкі раён). Цікава, што дзеля гэтай пасады жанчыне прыйшлося адмовіцца ад кар'еры навукоўца.

— Лёс непрадказальны. Я працавала малодшым навуковым супрацоўнікам Палескай вопытнай мелія-ратыўнай станцыі, збіралася паступаць у аспірантуру, пісаць кандыдацкую дысертацыю, — успамінае Галіна. — Неўзабаве да нашага дырэктара звярнуўся старшыня мясцовага сельскага Савета ў пошуках новага сакратара. Патрабаванні да кандыдата наступныя: жанчына сярэдняга ўзросту з бездакорнай біяграфіяй, каб была замужам і мела дзяцей, прыемнай знешнасці, адказная і выхаваная. Але галоўная ўмова — вышэйшая адукацыя. Таму старшыня і шукаў сабе памочніка на станцыі: у нас было шмат спецыялістаў з дыпломам ВНУ. Але я аказалася адзінай у калектыве, хто падыходзіў па ўсіх пунктах. Кідаць навуку не хацелася, муж быў супраць. Доўгія сумненні, развагі — і вось я ўжо афармляю першыя ў сваім жыцці даведкі, рыхтую справаздачы і статыстыку, а ў выхадныя дні прашу маладых абмяняцца заручальнымі пярсцёнкамі. Дарэчы, звышурочныя нам ніхто не аплачваў. Рабілася ўсё выключна на энтузіязме.

«Аднойчы ў залу ўвайшла пара. Жаніх шапнуў нешта нявесце, развярнуўся і... сышоў. Я і госці — у шоку».

Рэгістрацыя шлюбаў на вёсцы — з'ява не такая частая, як у горадзе. За год Галіна Іванаўна распісвала каля дваццаці пар. Затое кожная цырымонія была пасапраўднаму запамінальнай і не падобнай на іншыя. З усімі маладымі праводзілі перадвясельныя кансультацыі, дзе тлумачылі, што і як будзе адбывацца. Казалі: «Узялі пярсцёнак — трымайце моцна, калі надзяваеце». Бо калі нешта пойдзе не па плане, госці абавязкова адрэагуюць: «Жыць ім у няшчасці»...

— Першым часам распісваць даводзілася ў сельскім клубе. У мяне была спецыяльная «абрадавая» бардовая сукенка. Упрыгожваў яе «медаль рэгістратара» на доўгім ланцужку, — успамінае жанчына. Нават праз столькі гадоў яна памятае словы, якія не раз даводзілася казаць усхваляваным маладым.

— Было тры варыянты ўрачыстай рэгістрацыі — на 15, 40 хвілін і гадзіну (з удзелам клубных супрацоўнікаў). Спачатку сур'ёзная частка — уласна роспіс, абмен пярсцёнкамі, пасля гэтага абавязкова гучаў гімн Савецкага Саюза. А першымі створаную сям'ю віншавалі дэпутат сельскага Савета і прадстаўнік прафкама (камсамола ці партыі), якіх запрашалі на кожную рэгістрацыю ў якасці ганаровых гасцей. Па жаданні маладых мы рыхтавалі для іх розныя конкурсы і забаўкі — прапаноўвалі вызначыць, хто будзе галоўным у сям'і, разламаўшы бохан хлеба; даведваліся, хто каго лепш ведае; у гумарыстычнай форме размяркоўвалі сямейныя абавязкі паміж сужэнцамі... Была ў нас і добрая традыцыя ўскладання кветак да помніка воінам і партызанам Вялікай Айчыннай вайны. Яна на вясковых вяселлях жыве і цяпер.

Перавага рэгістрацыі шлюбу ў сельвыканкаме — вы тут будзеце адзінай парай. Ніхто не стане падпіхваць у спіну і не паскардзіцца, калі спозніцеся. Да таго ж на вёсцы можна рэалізаваць самыя смелыя ідэі — прыехаць на цырымонію на кані ці замовіць выступленне цэлага аркестра з мясцовага ДК.

На думку Галіны Іванаўны, цяперашняя моладзь на вяселлях дадае шмат увагі дробязям, якія таго не вартыя. Палову святочнага дня адводзяць на падрыхтоўку (макіяжы, прычоскі, зборы) і фотасесію. Быццам ідзе спаборніцтва — «у каго сукенка прыгажэйшая, больш шыкоўны лімузін ці дарагэйшы рэстаран». Раней засяроджваліся на самім моманце заключэння шлюбу, былі больш уважлівыя адно да аднаго, а не да аб'ектыву фотакамеры.

У самой Галіны Іванаўны пышнага вяселля не было. З мужам яны распісваліся ў гэтым жа сельвыканкаме 31 снежня. Спяшаліся, таму што ў студзені павінна было прайсці размеркаванне жылля. Давалі яго, вядома, толькі сямейным.

— Вэлюм пазычыла ў суседскай дзяўчыны, сукенка і туфлі на мне былі з выпускнога. А святочную вячэру мы зладзілі ўжо пасля заканчэння посту — на Раство, — расказвае жанчына. — Мікалай — маё першае каханне, мой першы мужчына, і гэта доўжыцца ўжо 47 гадоў. Таму, распісваючы іншыя пары, я ніколі нават думкі не мела, што яны могуць развесціся. «Раз і назаўсёды» — адзіны пасыл, які я адрасавала маладым.

Ганна КУРАК.

Супраць траўматызму

ТЭРЫТОРЫЯ БЯСПЕЧНАГА ДЗЯЦІНСТВА

Штогод у Беларусі 150 тысяч дзяцей атрымліваюць траўмы, а 150 гінуць. Аб гэтым ішла размова падчас прэс-канферэнцыі, прысвечанай сацыяльнаму праекту «Дзеці ў бяспецы».

— Як маці траіх дзяцей і ўрач ведаю, што вельмі важна не толькі нарадзіць здаровых дзетак, але і вырасціць іх здаровымі, — расказвае **ініцыятар праекта, кіраўнік Цэнтра падтрымкі мацярынства і дзяцінства «Мамстарт» і кампаніі «Мамэксперт» Наталля НАЎРОЦКАЯ.** — Мы ставім перад сабой задачу мінімізаваць рызыкі траўматызму ў дзяцей, павышаючы адукаванасць і адказнасць бацькоў ў гэтым кірунку.

Ініцыятары праекта расказалі, што бацькі часта не ведаюць, які новы навык развіўся ў іх малога, і з-за гэтага здараюцца траўмы. Асаблівасцю нашага менталітэту з'яўляецца рэактыўная рэакцыя на траўміраванне. Іншымі словамі, мамы і таты зрэдку займаюцца прафілактыкай — пакуль не здарыцца небяспечная непрыемнасць.

Маладым маці часта хочацца выглядаць ідэальнымі. І калі раптам з дзіцем здараецца няшчасце, жанчына замыкаецца ў сабе з-за пачуцця віны і проста замоўчвае гэты факт. А на самай справе ў кожнай мамы набярэцца з дзясятак выпадкаў, калі жыццё і здароўе малога былі пад пагрозай, — аж да падзення са спавівальных сталоў. Звычайна афіцыйная статыстыка — гэта невялікі працэнт тых няшчасных выпадкаў, якія здараюцца ў сем'ях.

— Мы хочам змяніць свядомасць бацькоў, — дадае Наталля Наўроцкая.— Каб яны, прывозячы немаўля дадому, стварылі бяспечнае для яго месца. Асабліва потым, калі дзіця пачынае актыўна рухацца. Увогуле, трэба гарантаваць бяспеку ўсёй траекторыі дзіцячага руху. Напрыклад, калі гаварыць аб памяшканні, то будзе добра, калі дарослы стане на калені, прапаўзе па ўсім доме ці кватэры і ўбачыць сваімі вачамі тое, што можа быць небяспечным для малога.

Ужо паўгода ініцыятары праекта разам з медыцынскімі работнікамі і супрацоўнікамі МНС ствараюць неабходныя матэрыялы для рэалізацыі праекта.

Звычайна афіцыйная статыстыка — гэта невялікі працэнт тых няшчасных выпадкаў, якія здараюцца ў сем'ях.

— Вельмі важна падтрымаць праект, які паслужыць прафілактыцы дзіцячага траўматызму,— падкрэслівае **намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па ахове здароўя Мінаблвыканкама Міхаіл ВІШНЯВЕЦКІ.** — Штогод у краіне гіне каля 150 дзяцей. Статыстыка паказвае, што яны часта атрымліваюць траўмы, іншы раз несумяшчальныя з жыццём, па недаглядзе і недасведчанасці маладых бацькоў.

— Мы на практыцы бачым, што мэтанакіраваная работа па навучанні насельніцтва ў сферы бяспекі дае вынікі, — расказала **начальнік сектара Рэспубліканскага цэнтра прапаганды МНС Анастасія КЛЯБАН.** — Калі малы праглынуў батарэйку, засунуў пальцы ў ацяпляльны прыбор, надзеў на галаву гаршчок і ў іншых шматлікіх сітуацыях, выклікаюць нас. Таму важна навучыць бацькоў вырашаць пытанні бытавога траўматызму ў першую чаргу самім, на месцы.

— Мы рады скааперавацца з грамадскай арганізацыяй у такой важнай справе, як бяспека дзяцей,— адзначыла **намеснік галоўнага ўрача клінічнага радзільнага дома Мінскай вобласці Таццяна БАСАЛАЙ.** — Навучанне будуць праходзіць не толькі ўрачы, але і сярэдні медперсанал — акушэркі і медсёстры, якія шчыльна кантактуюць з дзецьмі і іх бацькамі.

Ініцыятыва «Дзеці ў бяспецы» рэалізуецца ў рамках праекта «Прафілактыка неінфекцыйных захворванняў, прасоўванне здаровага ладу жыцця і падтрымка мадэрнізацыі сістэмы аховы здароўя ў Рэспубліцы Беларусь» (БЕЛМЕД), які фінансуецца Еўрапейскім саюзам і рэалізуецца ПРААН, САА3, ЮНІСЕФ і ЮНФПА ў партнёрстве з Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

У рамках праекта медработнікаў навучаць правілам фарміравання бяспечнай прасторы для дзяцей, каб у далейшым яны дзяліліся гэтымі ведамі з маладымі бацькамі. Мяркуецца выкарыстаць фармат трэнінгаў, майстар-класаў, семінараў, відэаканферэнцый і вебінараў. У радзільнях створаць куткі бяспекі, дзе маладым мамам будуць расказваць пра пагрозы малым, якія тоіць жылая прастора, і навучаць іх прадухіляць. Ужо вядзецца работа па стварэнні інтэрактыўнай карты дома, якая пакажа яго праблемныя ўчасткі.

Таксама рыхтуецца да запуску новая рубрыка «Для бацькоў» у мабільнай праграме МНС «Дапамога побач».

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Статыстыка дзіцячага траўматызму па Мінскай вобласці (выключаючы Мінск) у 2018 годзе:

— Паказчык траўматызму на 100 тысяч дзіцячага насельніцтва — 6 440. (Агульная колькасць дзяцей (0—18 гадоў) у рэгіёне складае 286 262 чалавекі.)

— У структуры першасных захворванняў траўмы і няшчасныя выпадкі займаюць другую пазіцыю — зарэгістравана 18 226 выпадкаў траўмаў.

— У структуры смяротнасці ва ўзросце ад 0 да 18 гадоў траўмы і няшчасныя выпадкі знаходзяцца на другім месцы.

— Ва ўзросце 0—6 гадоў па прычыне траўмаў і няшчасных выпадкаў загінулі 6 дзяцей:

— ад асфіксіі — 4 дзіцяці (2017 год — 4 дзіцяці);

— на пажары — 1 дзіця (2017 год — 0 выпадкаў);

— забойства — 1 выпадак (2017 год — 0 выпадкаў).

Няшчасныя выпадкі, траўмы і атручванне з'яўляюцца асноўнай прычынай смерці дзяцей і складаюць сярод немаўлят 6,5 %, сярод дзяцей 1—4 гадоў — 40 %, сярод падлеткаў — 67 % ад усіх смяротных выпадкаў.

Убачыць, адчуць, асэнсаваць

ДАЗВОЛЬ САБЕ БЫЦЬ... НЕСУР'ЁЗНЫМ

— Добры дзень! Дык вось як усё выглядае! — мужчына жвава ўваходзіць у кабінку да псіхолага. — Ніколі раней не сустракаўся з псіхолагам сам-насам, а тут рашыўся, адстаяў у чарзе, каб да вас патрапіць.



У Мінску ўжо некалькі гадоў запар праводзяцца сацыяльныя выстаўкі-кірмашы «50+», падчас якіх кожны ахвотны любога ўзросту мае магчымасць бясплатна пракансультавацца ў псіхолага, тэрапеўта, герыятра, эндакрынолага, кардыёлага.

...Мужчына зайшоў у кабінку да псіхолага вельмі асцярожна. Ён прысеў на крэсла і моўчкі глядзеў на мяне.

— Калі ласка, раскажыце, што ў вас здарылася, — прапанавала я.

— Як? — здзіўлена ўсклікнуў мужчына. — А вы хіба не бачыце па мне, што здарылася? Я думаў, што псіхолагі бачаць кожнага чалавека наскрозь!

Давялося тлумачыць наведвальніку, што гэта не зусім так. Пасля гэтага ён расказаў аб праблемах у сям'і.

— Жонка лічыць, што я мушу аб усім здагадвацца сам, без усякіх яе тлумачэнняў і абмеркаванняў за «сталом перагавораў!», — прамовіў ён, і адразу ж заўсміхаўся, бо зразумеў: сам толькі што менавіта так сябе павёў, спадзеючыся, што псіхолаг пра ўсё здагадаецца з першага позірку. Добра, дарэчы, што, клапоцячыся аб захаванні сям'і, ён звярнуўся па псіхалагічную дапамогу. Такія мужчыны заслугоўваюць павагі.

Перада мною наступная наведвальніца — жвавая, сімпатычная жанчына. Некалькі гадоў таму з-за праблем са здароўем ёй давялося звольніцца з работы. Калісьці яна перажывала, што на пенсіі не будзе чым заняцца. Але прайшло ўжо некалькі гадоў, а жыццё яе па-ранейшаму вельмі актыўнае. Жанчына выступае з лекцыямі, дзеліцца карыснай інфармацыяй з людзьмі сталага веку, навучае іх карыстацца камп'ютарам і інтэрнэтам. У мяне яна кансультавалася, як зрабіць сваё жыццё яшчэ больш насычаным (бо часам гэтаму замінала яе залішняя сарамлівасць), каб дапамагаць іншым людзям, — і гэта нягледзячы на праблемы са здароўем, якія, на жаль, нікуды не зніклі. Можна толькі падзякаваць такім пенсіянерам!

Убачыць, адчуць, асэнсаваць свае памкненні, жаданні, мары. Азірнуцца навокал. Заўважыць, што дзеці (а можа нават і ўнукі) ужо даўно сталі дарослымі і самастойнымі. Заняцца самаўдасканаленнем, паглыбіцца ў свой унутраны свет. Знайсці, заўважыць аднадумцаў, загарэцца ідэямі. Смела распачаць штосьці новае. Убачыць тых, хто мае патрэбу ў дапамозе. Падтрымаць таго, хто сумняваецца ў сваіх сілах... Усё гэта можна зрабіць самастойна або... звярнуцца да псіхолага па кансультацыю — ён дакладна дасць патрэбную параду.

Псіхалагічная дапамога ў нас вельмі запатрабаваная, таму на сацыяльных выстаўках яна аказваецца бясплатна і ананімна. Людзі прыходзяць з разнастайнымі праблемамі і пытаннямі, часам вельмі сур'ёзнымі, вырашэнне якіх патрабуе шматдзённай працы з прафесіяналам. Падчас выстаўкі спецыялісты аказваюць першую псіхалагічную дапамогу і раяць чалавеку, куды варта звярнуцца далей.

Кансультуючы наведвальнікаў, заўважыла, дарэчы, адну тыповую рэч: некаторыя з іх нібыта апраўдваюцца за свае захапленні. Бывае, што чалавек выконвае сур'ёзную работу, займае адказную пасаду, а падчас адпачынку любіць пачытаць «бульварныя» раманы і дэтэктывы, паглядзець забаўляльныя перадачы, паразгадваць красворды. Сябры і сваякі асуджаюць яго, бо лічаць такія заняткі занадта «легкадумнымі». У чалавека ўзнікае пачуццё віны за тое, што дазволіў сабе быць недастаткова сур'ёзным.

Але ж усім нам варта больш прыслухоўвацца да сябе, да ўнутранага голасу, і часцей дазваляць сабе быць шчаслівымі.

Калі мой пляменнік быў маленькі, ён, як і ўсе дзеці, вельмі любіў глядзець мультфільмы. Я ўключала тэлевізар і садзілася глядзець мультыкі разам з ім, каб потым іх абмеркаваць. «Я ведаю, ты ўключаеш іх для сябе! — смяяўся хлопчык. — Але ты — дарослая, таму ты робіш выгляд, што ўключаеш іх для мяне!» І ён меў рацыю...

Марына БАБРОЎСКАЯ.

«Калі мужчыны даюць волю пачуццям, гэта прыгожа»

«Ніколі не паеду на здымку раздражнёнай»

— Як вы захапіліся фатаграфіяй?

— Сама я не здымаю: працую ў пары як кіраўнік працэсу. Калі была замужам за вядомым фатографам, ездзіла ў Амерыку на вучобу і зразумела, што ньюбарн-фатаграфія (англійскае «newborn» — нованароджаны. — **Аўт.**) там актыўна развіваецца, а ў нас пра яе ніхто не ведае. Гэта быў 2007 год. У нашых сяброў тады якраз сталі нараджацца дзеці, і мы спрабавалі іх здымаць. Я скончыла ледзь не ўсе курсы для цяжарных, па дынамічнай гімнастыцы, бэбі-ёзе, каб навучыцца працаваць з немаўлятамі.

Такая фатаграфія — як першая памяць аб малым. У яго яшчэ пушок на плечыках і вушках, маршчынкі на пятках, вялікая ў параўнанні з астатнім целам галава. Звычайна першы час пасля нараджэння малога бацькі знаходзяцца ў добрым шоку, пад аксітацынамі, і не паспяваюць гэта ўсё заўважыць. Задача ньюбарн-фатографа ў тым, каб схапіць гэты момант, бо праз тры тыдні дзіця ўжо будзе абсалютна іншае.

Тэхнічны бок у такой здымцы займае другое месца. Самае важнае — умець працаваць з немаўлём: бяспечна, гігіенічна, акуратна. Бо гэта самае дарагое, што можа быць у цябе ў руках. Трэба таксама ўмець працаваць з бацькамі, бо мама, калі гэта першае дзіця, вельмі хвалюецца, а тата, як каршун, ахоўвае сваю прастору (і гэта здарава).

90 працэнтаў кадраў робіцца, калі малы спіць. Чаму? Бо ў астатні час нованароджаныя не вельмі сімпатычныя *(усміхаецца)*. Заўсёды грымаснічаюць, махаюць ручкамі.

— Як праходзіць здымка?

— Уваходзячы ў дом, ты павінен за 10 секундаў адсканаваць сітуацыю, якая там адбываецца, зразумець, хто галоўны, і з ім пачынаць весці перамовы. Калі я бачу, што мама нервуецца, не чапаю дзіця — спачатку іду з ёй на кухню піць гарбату. Мы размаўляем пра цяжарнасць, урачоў... І праз хвілін 15, калі мама стане давяраць, можна пачынаць. У мяне дастаткова кампетэнцый адносна дзіцяці: ведаю, калі яно галоднае, як правільна яго прыкласці да грудзей, як зрабіць масаж, каб не балеў жывоцік. Некаторыя пасля кажуць: «Усё, вы самае галоўнае ўжо зрабілі: яно не крычыць».

Нельга ставіцца да гэтай фатаграфіі выключна як да камерцыйнага праекта. Трэба падыходзіць з любоўю. Калі я нядобра сябе адчуваю, раздражнёная, то ніколі не паеду на здымку.

Мы прывозім з сабой два чамаданы рэчаў: пледы, бодзікі, падушачкі... Ёсць яшчэ машына белага шуму. Яна робіць роўны гук, як гул у самалёце, каб шчаўчок затвора быў не такі рэзкі. Дзеці не рэагуюць на манатонны шум і спакойна спяць. Цяпер такі гук можна спампаваць на тэлефон, а раней я прапаноўвала бацькам уключыць фен ці пыласос, каб малы перастаў капрызіць.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Падчас здымачнага працэсу.

— Бачыла, што вы заўсёды ў масцы.

— Гэта ўжо звычка. Я працую блізка з дзіцем, прыціскаю яго да сябе. Для мяне гэта сродак гігіены. І так псіхалагічна камфортней бацькам.

У пакоі, дзе мы здымаем, заўсёды працуе абагравальнік, бо калі немаўля пераадзяваеш, яно не павінна адчуваць розніцу ў тэмпературы, інакш прачнецца.

— У вашай камандзе сярод фатографаў ёсць мужчыны. Мамы як да іх ставяцца?

— Класна. Мужчыны, з якімі я працую, вельмі тактоўныя: яны самі бацькі.

Наогул для мяне важна ўключыць татаў у працэс. Бо іх часта не пускаюць даглядаць дзіця, толькі крытыкуюць: няправільна адзеў, няправільна трымаеш. І праз дваццаць тыдні мужчыну становіцца нецікава, ён больш не спрабуе. Мы дапамагаем пераадолець бар'ер. Просім тату ўзяць плед, быццам незнарок перадаём у рукі дзіця. Першы час ён баіцца, затое калі з'язджаем, ужо ўпэўнена трымае малога.

— Цяпер многія выкладваюць фота дзяцей у сацыяльных сетках. Вы як да гэтага ставіцеся?

— Я не выкладваю фота без дазволу бацькоў і пакуль немаўляці не споўнілася хоць бы тры месяцы. Свайго сына ў зусім маленькім узросце таксама ў сацыяльных сетках не паказвала. Але ў цэлым не бачу ў дзіцячых здымках нічога дрэннага. Як чалавек, які верыць у светлае, спадзяюся, што гэтыя фота выклікаюць пазітыў — яны не могуць не кранаць.

«У нашай культуры мала падзякі мужчынам»

— Пра што можна размаўляць праз фатаграфію?

— Калі я рабіла першую выстаўку да Дня маці каля мінскай ратушы, казала пра тое, што дзіця не перашкаджае маці быць бізнес-лэдзі і рэалізоўваць творчыя праекты, — наадварот раскрывае яе. Падчас другой выстаўкі «Я побач» мы прасілі жанчын напісаць лісты падзякі сваім мужчынам за простыя рэчы — памяняў уночы падгузак малому і даў паспаць, пасля работы застаўся адзін з трыма дзецьмі і адпусціў з сяброўкай папіць кавы. Так атрымалася, што свайго сына я расціла адна, і, прыязджаючы ў сем'і, часта назірала, што жанчыны ўспрымаюць як належнае, што мужчына іх забяспечвае, клапоціцца. Мне хацелася зрабіць мам крыху больш шчаслівымі і паказаць, як шмат у іх ёсць. Прыемна было глядзець на мужчын, якія стаялі на выстаўцы з шырока распраўленымі плячыма. Бо ў нашай культуры мала падзякі мужчынам. У мяне ёсць некалькі здагадак, чаму так.

— Падзяліцеся...

— Мне здаецца, жанчыне страшна, што калі яна будзе хваліць мужчыну, то ў нейкі момант яе слабасці ён можа сысці. Таму мы любім заядаць *(смяецца)*. Замест таго, каб старацца самой быць класнай, прыніжаем мужчыну: маўляў, куды ж ты без мяне. Гэта раз.

Другое — гэта нейкі прынцып: калі я прыгожая, ты мне вінен. Я падтрымліваю лад сям'і, дзе мужчына здабытчык, але ў жанчыны таксама ёсць абавязкі.

Вязаныя цуда-васьміножкі для неданошаных дзетак.

Я сабе наўпрост у напамінальцы запісваю: «дзякаваць». Бо ты сама ад гэтага становішся багацейшай.

— Некалькі гадоў вы займаецеся дапамогай неданошаным дзецям. Што падштурхнула да гэтага праекта?

— Калі мы былі на здымках ў Літве, мясцовы фонд неданошаных дзяцей папрасіў прыехаць у аддзяленне і зняць дзяўчынку для буклета. Яна важыла паўтара кілаграма. Я вельмі прасякнулася, колькі ў тым дзіцяці было прагі да жыцця.

Наша арганізацыя займаецца больш інфармацыйна-прафілактычнай дапамогай. Напрыклад, падтрымліваем праект па вязанні цуда-васьміножак. Такія цацкі добра ўплываюць на развіццё нервовай сістэмы і дапамагаюць дзецям супакоіцца: шчупальцы васьмінога нагадваюць немаўлятам пупавіну. Мы збіраем і перадаём медустановам ваўняныя шкарпэткі для нованароджаных — яны не толькі саграваюць, але і стымулююць кровазварот.

Праводзілі таксама конкурс ньюбарн-фатографаў, а за грошы, якія сабралі як узносы за ўдзел, купілі гнёзды для неданошаных дзетак і развезлі па радзільнях.

— Вы з'яўляецеся адным з каардынатараў праекта «MamaPro». Летась кангрэс сабраў больш за тысячу наведвальнікаў. Чаму семінары для будучых бацькоў сталі запатрабаванымі? Здавалася б, у інтэрнэце можна прачытаць усё.

— У сеціве няма адчування даверу. Таму, калі перад бацькамі выступае эксперт, да якога трапіць на прыём можна, толькі запісаўшыся за некалькі месяцаў, яны больш упэўнены, што інфармацыя надзейная.

Сам праект — гэта вялікая ідэя акушэра-гінеколага Дзіяны Мардас. Я далучылася, каб дапамагаць з арганізацыяй. За мінулы год мы праехалі ўсе рэгіёны.

У студзені ўручалі мамам у радзільнях падарункавыя каробкі з рэчамі, неабходнымі ў першыя дні жыцця дзіцяці. Гэта пілотны праект, запусцілі яго ў Мінску. Хоць сама ініцыятыва з боксамі ёсць больш чым у 80 краінах свету. У Фінляндыі, напрыклад, дораць вялікую каробку, якую можна выкарыстоўваць як ложачак.

Мы праводзілі таксама майстар-класы для татаў. Іх адметнасць была ў тым, што медыйныя бацькі выходзілі на сцэну і гаварылі пра свае страхі. Паказвалі, што гэта нармальна — чагосьці не ведаць.

— Не саромеліся таты ўдзельнічаць у сустрэчах? Усё ж такі абмяркоўваць сямейныя пытанні «не па-мужчынску».

— Ведаеце, нават на кангрэсах для мам чвэрць наведвальнікаў былі таты. Гэта кажа пра тое, што яны ўсё больш уключаюцца ў падрыхтоўку да родаў, выхаванне дзяцей. Ім не ўсё роўна, якія ўмовы ў радзільні, які ўрач будзе глядзець жонку. Мужчыны задаюць шмат пытанняў.

«Няма ідэальнай сям'і, як на білбордзе»

— Неяк у інтэрв'ю вы казалі, што не зусім правільна, калі фота заўсёды транслюе ідэальную сям'ю. Чаму?

— Мне падабаецца, калі фатаграфія жывая, шчырая. Хочацца паказаць сям'ю такой, якая яна насамрэч. Класна, калі дзеці злуюцца або ўсміхаюцца на здымку. Больш за ўсё чапляюць эмоцыі, а не правільная кампазіцыя.

Яшчэ адзін фактар — няма ідэальнай сям'і. А калі на білбордзе заўсёды «мама, тата, двое дзяцей і сабака», астатнія, параўноўваючы рэальнасць з гэтай карцінкай, адчуваюць сябе няўдачнікамі. Але ў іншых сем'ях не менш прыгажосці і любові.

Ведаеце, калі мужчыны дазваляюць сабе адчуваць, гэта вельмі прыгожа. Мне здаецца, нашы праекты падсвечваюць прыгажосць узаемаадносін. Для таго каб людзі змаглі паглыбіцца ў пачуцці, іх трэба здымаць не менш, чым дзве гадзіны, бо спачатку яны саромеюцца, заціскаюцца. Я сама працавала мадэллю і ведаю, як гэта — быць па той бок аб'ектыва.

— Якая вы мама? Як выхоўваеце сына?

— Я старалася не змешваць адносіны з мужчынам і з дзіцем. Гэта вельмі балюча, калі ў жанчыны ёсць нявыказаныя прэтэнзіі да мужчыны, з якім яна не жыве, і яна пачынае выказваць негатыў малому: твой тата дрэнны, мне не дапамагае.

Для мяне дзеці, якія выхоўваюцца адным з бацькоў, як птушкі з адным крылом. Таму на пару тыдняў, на месяц сын ездзіць да таты, каб праводзіць час разам. Тлумачу Оскару, што мы проста не жывём з яго бацькам, але ён заўсёды будзе яго любіць. І мне здаецца, я спраўляюся. У сына няма траўмы.

Мне было важна не падстройваць сваё жыццё пад дзіця. Я бачу шмат гісторый, калі мама выгарае за паўтара-два гады, бо цалкам пераключаецца на малога. У мяне крыху іншы падыход. Мы шмат ляталі з сынам з самага маленства. У два гады, калі адпраўляліся ў Маямі, я ўжо не трымала яго за руку. Казала: «Сын, я нясу чамаданы, каляску, заплечнік, і твая задача — не згубіцца». Оскар — самастойны хлопец.

— Сёння ад жанчын многага патрабуюць: выхоўваць вундэркіндаў, весці паспяховы бізнес, бездакорна выглядаць. Вы адчуваеце гэты ціск?

— Так. І гэта няпроста. Стаць добрай мамай можна, толькі калі адчуваеш патрэбы свае і дзіцяці, а для гэтага трэба быць у стане спакою. А тут суцэльны стрэс: жанчына мусіць рэзка пахудзець пасля родаў, падцягнуць грудзі пасля кармлення, усё паспяваць... Вельмі часта бізнес у дэкрэце пачынаюць не таму, што так хочацца, а таму, што вельмі страшна засядзецца, ператварыцца ў квактуху. Насамрэч, лепш першы час занырнуць у радасці мацярынства. Потым ты адчуеш той адпраўны пункт, калі гатовы выходзіць у грамадства, рабіць праекты. У мяне гэта было праз год пасля родаў.

Крута, што ў нас дэкрэт тры гады. Ёсць магчымасць намацаць, чым ты хочаш займацца. Хапае ж гісторый, калі жанчына пасля нараджэння дзіцяці выходзіць у іншую сферу. Чаму яна не магла зрабіць так дагэтуль? Бо мы як у гонцы: школа, універсітэт, замужжа, кар'ера. А мацярынства дае глыбокае адчуванне сябе.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
Фота з архіва гераіні.

ООО «Центр эксперт-услуг плюс»
ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
по продаже имущества, принадлежащего Кормянскому РАЙПО
(Гомельская обл., г. п. Корма, ул. Абатурова, 37) (стоимость снижена на 20 %)

Лот №	Наименование имущества	Начальная цена лота с НДС, руб.	Задаток 10 %, руб.	Шаг аукциона 5 %, руб.
1	2	3	4	5
1	Капитальное строение (здание специализированное организаций оптовой торговли, материально-технического снабжения и сбыта продукции) с инвентарным номером 323/С-20541 общей площадью – 73,2 кв. м, расположенное по адресу: Гомельская область, г. п. Корма, ул. Школьная, 4, на земельном участке с кадастровым номером 322555100001001867 площадью 0,0103 га, предоставленном на праве постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством	7 296,00	729,60	364,80

Задаток перечисляется на расчетный счет BY33PJCB30124047901000000933 в «Приорбанк» ОАО ЦБУ 400 г. Гомель, БИК PJCBBY2X, УНП 491331464, получатель платежа – ООО «Центр эксперт-услуг плюс», назначение платежа: задаток для участия в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 31.01.2019 г.

Аукцион состоится **15 февраля 2019 г.** в 12.00 по адресу: г. Гомель, ул. Старочерниговская, 7а. Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются по 13 февраля 2019 г. до 14.00 по указанному адресу. Перечень документов, необходимых для участия в аукционе, размещены на нашем сайте (auction.standard.by) в разделе «ДОКУМЕНТЫ».

Участник, ставший победителем аукциона или единственным участником аукциона, который согласится приобрести предмет аукциона по начальной цене продажи, увеличенной на 5 % обязан:

в течение 3-х (трех) рабочих дней после подписания в день проведения аукциона протокола о результатах аукциона возместить лицу (Заказчику или Исполнителю в соответствии с договором), понесшему затраты на организацию и проведение аукциона (расходы на публикацию обязательных извещений, подготовку и публикацию рекламных материалов). Размер такого возмещения не должен превышать суммы фактических затрат на организацию и проведение аукциона, а также включать затраты по ранее проведенным нерезультативным, несостоявшимся аукционам, в случае повторного выставления объекта на торги и определяется на основании представленных документов; в течение 10 (десяти) рабочих дней после подписания в день проведения аукциона протокола о результатах аукциона заключить с Заказчиком договор купли-продажи объекта недвижимости (далее договор купли-продажи); произвести оплату за объект недвижимости в течение 10 (десяти) календарных дней после подписания договора купли-продажи.

Результаты торгов подлежат аннулированию организатором торгов в случае если победитель торгов уклоняется или отказывается в установленные сроки от подписания протокола и (или) договора, оформляемого по результатам торгов, возмещения затрат, связанных с организацией и проведением торгов.

Организатором торгов является ООО «Центр эксперт – услуг плюс» (адрес: г. Гомель, ул. Старочерниговская, 7а).

По вопросам участия в аукционе и приобретения имущества обращаться по телефонам: +375 (29) 3033933, тел./факс 8 0232 21-21-61.

По вопросам осмотра имущества тел. +375 (44) 7843654

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

Извещение о проведении открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность и прав заключения договоров аренды земельных участков в г. Лида и Лидском районе

Аукцион состоится в 11.00 1 марта 2019 г. в г. Лида по ул. Советской, 8.
Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. Последний день приема заявлений – 25 февраля 2019 г. до 15.00. Телефон для справок: 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». http://grodnoino.by

Номер лота	1	2	3
Адрес земельного участка, кадастровый номер, площадь	г. Лида, ул. Центральная, У-1285, 423650100013002253, площадь 0,1018 га	г. Лида, ул. Центральная, У-1286, 423650100013002254, площадь 0,1027 га	г. Лида, ул. Центральная, У-1288, 423650100013002240, площадь 0,1071 га
Право на земельный участок	Право частной собственности	Право частной собственности	Право частной собственности
Начальная цена земельного участка, руб.	16 352,62 руб. (шестнадцать тысяч триста пятьдесят два рубля шестьдесят две копейки)	16 497,19 руб. (шестнадцать тысяч четыреста девяносто семь рублей девятнадцать копеек)	17 203,98 руб. (семнадцать тысяч двести три рубля девяносто восемь копеек)
Задаток, руб.	1 635 руб. (одна тысяча шестьсот тридцать пять рублей)	1 650 руб. (одна тысяча шестьсот пятьдесят рублей)	1720 руб. (одна тысяча семьсот двадцать рублей)
Дополнительное условие	Возместить затраты: за изготовление градостроительного паспорта 319,45 руб. За землеустроительное дело по формированию земельного участка для проведения аукциона 866,83 руб. За государственную регистрацию создания земельного участка и возникновения прав на него – 63 руб.	Возместить затраты: за изготовление градостроительного паспорта 319,45 руб. За землеустроительное дело по формированию земельного участка для проведения аукциона 895,81 руб. За государственную регистрацию создания земельного участка и возникновения прав на него – 63 руб.	Возместить затраты: за изготовление градостроительного паспорта 319,45 руб. За землеустроительное дело по формированию земельного участка для проведения аукциона 895,81 руб. За государственную регистрацию создания земельного участка и возникновения прав на него – 63 руб. По ранее проводимым нерезультативным аукционам по данному участку 136,99 руб.

Номер лота	4	5	6
Адрес земельного участка, кадастровый номер, площадь	г. Лида, ул. Центральная, У-1298, 423650100013002256, площадь 0,1066 га	г. Лида, ул. Народная, 35, 423650100013002285, площадь 0,1260 га	г. Лида, У-292, 423650100002000805, площадь 0,1246 га
Право на земельный участок	Право частной собственности	Право частной собственности	Право частной собственности
Начальная цена земельного участка, руб.	17 123,67 руб. (семнадцать тысяч сто двадцать три рубля шестьдесят семь копеек)	19 548,18 руб. (девятнадцать тысяч пятьсот сорок восемь рублей восемнадцать копеек)	16 425,73 руб. (шестнадцать тысяч четыреста двадцать пять рублей семьдесят три копейки)
Задаток, руб.	1 712 руб. (одна тысяча семьсот двенадцать рублей)	1 955 руб. (одна тысяча девятьсот пятьдесят пять рублей)	1 642 руб. (одна тысяча шестьсот сорок два рубля)
Дополнительное условие	Возместить затраты: за изготовление градостроительного паспорта 319,45 руб. За землеустроительное дело по формированию земельного участка для проведения аукциона 851,29 руб. За государственную регистрацию создания земельного участка и возникновения прав на него – 63 руб.	Возместить затраты: за изготовление градостроительного паспорта 317,65 руб. За землеустроительное дело по формированию земельного участка для проведения аукциона 945,36 руб. За государственную регистрацию создания земельного участка и возникновения прав на него – 136,50 руб.	Возместить затраты: за изготовление градостроительного паспорта 306,88 руб. За землеустроительное дело по восстановлению границы земельного участка для проведения аукциона 628,54 руб. По ранее проводимым нерезультативным аукционам по данному участку 61,87 руб.

Номер лота	7	8
Адрес земельного участка, кадастровый номер, площадь	г. Лида, ул. Фомичева, 423650100003001589, для строительства и обслуживания объекта: «Строительство ПТО на 2 поста в г. Лида район ул. Фомичева» 0,3182 га	г. Лида, ул. Фомичева, 423650100003001857, для строительства и обслуживания объекта: «Строительство магазина по адресу: г. Лида, ул. Фомичева», 0,3970 га
Право на земельный участок	Право заключения договора аренды сроком на 10 (десять) лет	Право заключения договора аренды сроком на 10 (десять) лет
Начальная цена земельного участка, руб.	15 675,61 руб. (пятнадцать тысяч шестьсот семьдесят пять рублей шестьдесят одна копейка)	21 996,34 руб. (двадцать одна тысяча девятьсот девяносто шесть рублей тридцать четыре копейки)
Задаток, руб.	1 567 руб. (одна тысяча пятьсот шестьдесят семь рублей)	2 200 руб. (две тысячи двести рублей)
Наименование ограничений в праве	С ограничением прав в пользовании частью земельного участка площадью 0,0028 га в охранных зонах электрических сетей	С ограничением прав в пользовании частью земельного участка площадью 0,0187 га в охранных зонах электрических сетей, площадью 0,0360 га в охранных зонах линий связи и радиофикации, площадью 0,0138 га в санитарно-защитных полосах водоводов
Дополнительное условие	Возместить затраты: за изготовление градостроительного паспорта – 848,91 руб. За землеустроительное дело по формированию земельного участка для проведения аукциона 1 011,06 руб. За государственную регистрацию создания земельного участка и возникновения прав на земельный участок – 68,40 руб. По ранее проводимым нерезультативным аукционам по данному участку 91,81 руб. Строительство подъездной дороги осуществить совместно с победителем аукциона по объекту: «Строительство автомойки на 2 поста в г. Лида район ул. Фомичева»	Возместить затраты: за изготовление градостроительного паспорта – 3 390,54 руб. За землеустроительное дело по формированию земельного участка для проведения аукциона – 1 254,62 руб. За государственную регистрацию создания земельного участка и возникновения прав на земельный участок – 96,90 руб. Возместить потери сельскохозяйственного производства в сумме 6 412,67 руб.

Номер лота	9	10
Адрес земельного участка, кадастровый номер, площадь	Агрогородок Едки, позиция 34, 423685403125000326, площадь 0,1208 га	д. Мотевичи, ул. Центральная, У-45, 423684603147000062, площадь 0,1711 га
Право на земельный участок	Право частной собственности	Право частной собственности
Начальная цена земельного участка, руб.	8 913,45 руб. (восемь тысяч девятьсот тринадцать рублей сорок пять копеек)	444,86 руб. (четыреста сорок четыре рубля восемьдесят шесть копеек)
Задаток, руб.	891 руб. (восемьсот девяносто один рубль)	45 руб. (сорок пять рублей)
Дополнительное условие	Возместить затраты: за изготовление градостроительного паспорта 315,89 руб. За землеустроительное дело по формированию земельного участка для проведения аукциона 310,84 руб. По ранее проводимым нерезультативным аукционам по данному участку 261,37 руб.	Возместить затраты: за государственную регистрацию прав на земельный участок – 48,75 руб.

Условия проведения аукциона в части продажи земельных участков в частную собственность

Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Земельные участки предоставляются в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме).

Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:
в течение десяти рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся:
внести плату за земельный участок;
возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка, государственной регистрацией создания этого участка;
осуществить в течение двух месяцев после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся государственную регистрацию прав, ограничений (обременений) прав на земельный участок;
при невыполнении требований об обращении в течение двух месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся за государственной регистрацией земельного участка и прав на него, результаты аукциона аннулируются;
в установленном законодательством порядке получить разрешение на выполнение проектно-изыскательских и строительных работ по строительству одноквартирного жилого дома;
в течение одного года со дня государственной регистрации возникновения права на земельный участок приступить к занятию данного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать строительство, иное освоение земельного участка);
возместить затраты в соответствии с Положением о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 1 апреля 2014 г. № 298;
предупредить победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона, что право частной собственности на земельный участок прекращается:
при неуплате земельного налога по истечении двух налоговых периодов;
при использовании земельного участка не по целевому назначению;
если гражданин в течение одного года со дня государственной регистрации возникновения права на земельный участок не приступил к занятию данного участка;
при неосуществлении мероприятий по охране земель, указанных в части первой статьи 89 Кодекса Республики Беларусь о земле;
при прекращении гражданства Республики Беларусь

Продажа земельного участка производится гражданам Республики Беларусь.

Шаг аукциона – 5 % от предыдущей цены

Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, представить в комиссию по проведению аукциона заявление, к заявлению прилагают:
– заверенную банком копию платежного поручения (квитанцию) о внесении задатка;
– копию документа, удостоверяющего личность (паспорт) покупателя или доверенного лица;
– доверенность, заверенную нотариально, если в аукционе участвует представитель физ. лица

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.
Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.
В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов

Условия проведения аукциона в части продажи права заключения договоров аренды земельный участков

Существует возможность подключения к городским сетям с условиями.
Победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:
в течение десяти рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся:
внести плату за право заключения договора аренды земельного участка;
возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка, государственной регистрацией создания этого участка.
Заключить с Лидским райисполкомом договор аренды земельного участка и осуществить в двухмесячный срок со дня подписания договора аренды земельного участка, но не позднее трех месяцев со дня подписания протокола аукциона, государственную регистрацию прав ограничений (обременений) прав на земельный участок.
Получить в установленном порядке архитектурно-планировочное задание и технические условия для инженерно-технического обеспечения объекта строительства, разрешение райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ, разработку строительного проекта на строительство объекта в срок не превышающий двух лет.
Приступить к строительству объекта в течение шести месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство такого объекта.
Завершить строительство объекта в сроки, определенные проектной документацией.
За нарушение сроков строительства взимаются пени в размере из расчета – ставки рефинансирования Национального банка (годовых) от стоимости строительства за каждый день просрочки

К участию в аукционе допускаются юридические лица, физические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:
– заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
– юридическим лицом резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
– копии учредительных документов – индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;
– юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе).
При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:
– представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
– физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;
– представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.
Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.

Шаг аукциона – 5 % от предыдущей цены

Номер р/с для перечисления задатка для участия в аукционе по продаже земельных участков в частную собственность и по продаже права аренды земельных участков – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

КІНУЦЬ НЕЛЬГА ВЫРАТОЎВАЦЬ

Як вырвацца з сузалежнасці?

Калі чалавек трапіў у залежнасць ад алкаголю, наркотыкаў ці азартных гульняў, блізкія ўсімі сіламі імкнуцца яго выратаваць і таксама... становяцца залежнымі. Не, яны не п'юць разам з імі гарэлку і не ўжываюць наркотыкі.
У іх развіваецца іншая залежнасць — псіхалагічная. Яны цалкам падпарадкоўваюць сваё жыццё «хвораму»: «Як я яго кіну — ён без мяне прападзе!», «Калі я гэтаму алкашу ежы не прыгатую, ён будзе харчавацца адной гарэлкай, а ў яго страўнік хворы». Для людзей, якія прысвяцілі сваё жыццё выратаванню сваякоў-алкаголікаў ці наркаманаў, псіхолагі прыдумалі тэрмін — сузалежнасць.

Хто, калі не я?

Калі спытаць сузалежных, чаму яны так жывуць, яны прывядуць шэраг аргументаў. Адзін з іх — людзей трэба шкадаваць, асабліва блізкіх. Хто, калі не я, сходзіць па піва для мужа (у яго ж галава расколваецца пасля ўчарашняга), хто памые яго бруднае адзенне, хто нарэшце будзе зарабляць грошы (алкаголікаў жа на работу не бяруць). Калі я не прыгледжу за ім, з ім што-небудзь здарыцца — замерзне, захварэе, трапіць у крымінальную гісторыю. Яшчэ адзін аргумент — да любога чалавека можна дастукацца. Вось і стукаюцца, нярэдка на працягу ўсяго жыцця. Яшчэ адно тлумачэнне — трэба пацярпець, ідэальных сем'яў не бывае. Альбо: «Лепш мучыцца з п'яніцам, чым застацца адной». Знаёма?

Чаму нельга жыць з такімі ўстаноўкамі і як ад іх пазбавіцца, а таксама як правільна сябе паводзіць з блізкімі з алкагольнай залежнасцю мы распыталі экспертаў — урачоў Гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Мінска, **псіхіятра-нарколага Вольгу МАЙБАРАДУ** і **псіхатэрапеўта Алену ДЗМІТРЫЕВУ.**

— Давайце спачатку разбяромся, што такое сузалежнасць.

В. М.: — Гэта глыбокая захопленасць, моцная эмацыянальная, сацыяльная і нават фізічная залежнасць ад іншага чалавека. Блізкія алкаголікаў, наркаманаў і іншых людзей з залежнасцямі эмацыянальна ўцягнуты ў гэтую хваробу, яны не толькі гадамі пакутуюць, але і будуюць такія адносіны ў сям'і, якія перашкаджаюць выздараўленню залежнага.

А. Д.: — Залежны і сузалежны з'яўляюцца, умоўна кажучы, злучанымі сасудамі. І чым цяжэй працякае залежнасць, тым складаней сузалежнасць. Ёсць і зваротны ўплыў: паводзіны сузалежнага патураюць залежнасці.

— Чаму ўзнікае такі паталагічны стан?

В. М.: — Алкаголікі схільныя вінаваціць у сваёй шкоднай звычцы блізкіх, яны пастаянна падкрэсліваюць, што іх не любяць, не ўдзяляюць увагу. І менавіта на пачуцці віны часцей за ўсё будуецца сузалежнасць пры алкагалізме.

«У сузалежных паводзінаў ёсць пэўныя прыкметы. Найперш, татальны кантроль над паводзінамі залежнага сваяка. Пры гэтым знікаюць свае патрэбы, інтарэсы, задавальненні».

А. Д.: — На з'яўленне сузалежнасці ўплывае і працяглы час сумеснага жыцця з чалавекам, які мае залежнасць, і дзіцячыя траўмы, і іншыя фактары. У любым выпадку сузалежнаму не трэба сябе вінаваціць. Лепш пастарацца разабрацца ў прычынах і стаць на шлях выпраўлення.

— Як праяўляецца сузалежнасць?

В. М.: — Гэта прыстасаванасць да чужой хваробы, страта ўласнай годнасці і значнасці. І заканамерным яе наступствам з'яўляецца прагрэсаванне хваробы ў залежнага. Паступова п'яніца перакладае цяжар адказнасці на сузалежных блізкіх. Сітуацыя складваецца такім чынам, што ўсё жыццё дамачадцаў круціцца вакол аднаго чалавека — хранічнага алкаголіка. Сваякі ліквідуюць праблемы, якія ён учыніў падчас чарговай папойкі, а затым апраўдваюць алказалежнага перад знаёмымі і калегамі. Падобныя паводзіны тлумачацца нежаданнем выносіць праблему за парог дома, а ў алкаголіка не застаецца ніякай адказнасці. Сузалежны, аднойчы дазволіўшы паводзінам іншага ўплываць на сябе, становіцца цалкам захопленым тым, каб кантраляваць дзеянні гэтага чалавека і такім чынам рэгуляваць свой стан.

Прыкметы сузалежнасці

— Як зразумець, што ты стаў сузалежным?

А. Д.: — У сузалежных паводзінаў ёсць пэўныя прыкметы. Найперш, татальны кантроль над паводзінамі залежнага сваяка. Пры гэтым знікаюць свае патрэбы, інтарэсы, задавальненні. Сузалежны не вольны ў сваіх пачуццях, думках, паводзінах. Яго пастаяннымі спадарожнікамі становяцца страх, трывога, крыўда, сорам і віна. Ён пастаянна турбуецца аб паводзінах свайго блізкага і баіцца за яго жыццё, узнікаюць думкі «куды пайшоў?», «з кім?», «колькі грошай у яго кішэні?», «дойдзе дахаты — не дойдзе?», «скраў — не скраў?», «прадаў — не прадаў?», «спаліў — не спаліў?» Гадамі знаходзячыся ў пастаянных негатыўных пачуццях, сузалежны паглыбляецца ў дэпрэсіўныя, трывожныя, псіхасаматычныя хваробы. Акрамя таго, сузалежныя пачынаюць апякаць залежнага: карміць за свае грошы, прыбіраць, мыць, абараняць ад міліцыі, хаваць залежнасць ад іншых сваякоў і суседзяў, пакуль гэта магчыма. Ствараючы такім чынам спрыяльныя ўмовы для ўзмацнення залежнасці.

В. М.: — Акрамя таго, такія людзі, як правіла, не жадаюць сачыць за сваім знешнім выглядам, не могуць кантактаваць з навакольнымі. Сям'я становіцца ізаляванай ад грамадства. Сузалежнасць праяўляецца апатыяй, навязлівымі думкамі, празмернай плаксівасцю. Такі чалавек часта замест займеннікаў «ён», «яго», «я» абагульняе сябе з алкаголікам — «мы», «нас»

— І што рабіць у такой сітуацыі?

В. М.: — Падобная карціна ў сям'і, дзе адзін — алкаголік, а другі пастаянна імкнецца яго выратаваць, сведчыць пра неабходнасць лячэння абодвух членаў сям'і. Сузалежнаму варта зразумець, што алкагольная залежнасць — гэта сур'ёзнае захворванне, якое мае патрэбу ў лячэнні, а не ў перавыхаванні хворага. Алкаголіку трэба ісці да нарколага, а сузалежнаму — да псіхатэрапеўта. Больш за тое, ім абодвум неабходная псіхалагічная кансультацыя па наладжванні адносін і карэкціроўцы мадэляў паводзінаў. Як і алкагалізм, сузалежнасць мае патрэбу ў прызнанні, і толькі тады яе можна вылечыць.

А. Д.: — Сузалежныя робяць мноства беспаспяховых спроб выратаваць залежнага. Яны ўжо неаднаразова прасілі, плакалі, патрабавалі, раілі, скандалілі, пагражалі, выратоўвалі — а ўсе гэтыя намаганні аказаліся марнымі. Тут трэба разумець, што выкарыстоўваючы ранейшыя меры, вы жадаеце атрымаць новыя вынікі неабгрунтавана. Але для выпраўлення сітуацыі ў сям'і варта выкарыстоўваць іншыя мадэлі паводзінаў.

Стаць сабой

— Як лечаць сузалежнага?

В. М.: — Калі пацыент прызнае, што ён хворы, пачынаецца псіхатэрапія. Гэта індывідуальныя гутаркі, навучанне таму, як супрацьстаяць стрэсавым сітуацыям, заняткі з псіхолагам у групе такіх жа сузалежных, кантактаванне з імі, навучанне навыкам спакойнага і гарманічнага суіснавання. У выніку такога лячэння пацыент павінен убачыць сваё жыццё збоку, толькі пасля гэтага ён зможа зразумець, што трэба рабіць і якую мадэль паводзінаў абраць для кантактавання з блізкім.

— Як правільна паводзіць сябе з алкаголікам? Ці трэба выліваць спіртное ці наадварот дазваляць піць дома?

В. М.: — Гвалтам і забаронамі змагацца з алкагалізмам блізкага бессэнсоўна. Той, хто п'е, заўсёды знойдзе спосаб ужыць. Таму няма ніякай карысці ў тым, што вы схаваеце грошы ці выльеце спіртное ў ракавіну. Гэта прывядзе толькі да таго, што ён пачне вытанчана лгаць ці хаваць частку зарплаты. Сапраўды, часта сузалежныя настройваюць сваяка не хавацца: калі ўжо п'е, няхай гэта робіць дома і знаходзіцца пад кантролем. Але так вы ствараеце толькі больш камфортныя ўмовы для алкаголіка. Акрамя таго, нельга апраўдваць непрыгожыя ўчынкі алкаголіка яго неадэкватным станам. Ніколі не даруйце таму, хто п'е, яго жорсткія паводзіны. Праблемы, якія ўзнікаюць у выніку злоўжывання спіртным, чалавек павінен вырашаць сам. Блізкія алкаголіка падчас тэрапіі павінны пастарацца стаць самадастатковымі асобамі — са сваімі жаданнямі, інтарэсамі і сваім жыццём. Бо менавіта ўпэўнены ў сабе чалавек, які не дасць шанцу вярнуцца да ранейшага існавання, і патрэбны былому залежнаму.

«Не патурайце алкаголіку, не дапамагайце яму грашыма, прадуктамі, адзеннем. Давайце параду толькі тады, калі вас аб ёй папрасілі».

— Ці можна самастойна зрабіць першыя крокі, каб пазбавіцца ад сузалежнасці?

А. Д.: — Для гэтага трэба пашукаць аднадумцаў, якія таксама хочуць змяніцца, і кантактаваць з імі. Важна ўсвядоміць і прызнацца сабе, што ёсць абставіны, на якія вы не ў сілах паўплываць. Паглядзець на сябе, зразумець сэнс свайго жыцця, навучыцца быць самім сабой. Успомніце дзяцінства і маладосць: няўжо вы марылі тады аб такім жыцці? Не патурайце алкаголіку, не дапамагайце яму грашыма, прадуктамі, адзеннем. Давайце параду толькі тады, калі вас аб ёй папрасілі. Будзьце ў сваіх паводзінах паслядоўныя і адзіныя — усёй сям'ёй. Не чакайце, што залежны чалавек паслухаецца вас і перастане злоўжываць спіртным. Без яго ўласнага жадання і лячэння гэтага, хутчэй за ўсё, не будзе.

Алена КРАВЕЦ.

Цікавы праект

НОВЫ ПОГЛЯД З ВЫШЫНІ

Да новага турыстычнага сезона ў Гродне плануюць запусціць «чортава кола»

Атракцыён усталююць у цэнтральным гарадскім парку імя Жылібера. Яго вышыня — 42 метры, што ўдвая вышэй за самыя высокія дрэвы. На ім прадугледжана незвычайная ілюмінацыя, а таксама адмысловыя аглядальныя кабінкі.

Кажуць, што новае — гэта даўно забытае старое. Так і з колам агляду ў Гродне. Такі атракцыён тут з'явіўся ў 70-х гадах мінулага стагоддзя ў парку побач з Каложскай царквой. Старэйшыя гродзенцы памятаюць гэтае месца, бо часта прызначалі тут сустрэчы. Але сам атракцыён быў хутчэй для амататараў экстрыму — кабінкі не зачыняліся і дрыжалі пры пад'ёме. Таксама значным мінусам быў і абмежаваны агляд. З самага высокага пункта можна было ўбачыць толькі Замкавае гарышча і Нёман. Гістарычная частка горада не аглядалася, бо вышыня кола дасягала толькі 8-павярховіка. Атракцыён адпрацаваў гадоў дзесяць і прыйшоў у аварыйны стан. У мэтах бяспекі яго разабралі.

І вось два гады таму ўзнікла ідэя ўзнавіць «чортава кола». Усталяваць яго планавалі ў тым жа Каложскім парку. Але справа зацягнулася, участак ніхто не набыў, інвестар, які спачатку агучыў свае намеры, праект не адолеў. І вось цяпер — чарговы захад. Новая фірма выйшла з іншай прапановай — пабудаваць кола ў гарадскім парку атракцыёнаў. Мясцовыя ўлады далі згоду і выдзелілі пляцоўку. «Чортава кола» будзе «ўціснута» ў паркавае асяроддзе, побач з атракцыёнам «амерыканскія горкі».

Дарэчы, зараз тут вядуцца работы па разведцы геалагічных пародаў: працуюць дзве свідравальныя ўстаноўкі. Пляцоўка ўзгоднена і ў Міністэрстве культуры. Але наперадзе яшчэ нямала тэхнічных узгадненняў і экспертыз. Плануецца, што на выраб кола спатрэбіцца тры месяцы, яшчэ месяц — на яго мантаж.

Такім чынам, вяртанне ў горад былога атракцыёна можа адбыцца ўжо ўвесну. Такія тэрміны абумоўлены і пачаткам турыстычнага сезона. Гродна ўжо два гады ўваходзіць у бязвізавую зону, і новы атракцыён зацікавіць найперш замежнікаў. А гэта не толькі эмоцыі, адрэналін, але і агляд гістарычнага цэнтра і навакольля з вышыні птушынага палёту. Безумоўна, забаўляльны аб'ект надасць гораду турыстычнай прывабнасці і можа стаць славутасцю абласнога цэнтра.

На коле зробяць 24 закрытыя кабінкі, кожная — на чатыры месцы. Паўсюдна прадугледжаны абагравальнікі, што дасць магчымасць працаваць колу ўвесь год, за выключэннем моцных маразоў. Месцы для замежнікаў будуць абсталяваны аўдыёгідамі на некалькіх мовах. Асаблівы эфект надасць ілюмінацыя. Плануецца, што падсветка будзе ў выглядзе лагатыпа Фестывалю нацыянальных культур.

Так выглядае гістарычны цэнтр Гродна з аглядальнай пляцоўкі кафэ «Дах свету», што на вуліцы Савецкай.

Адно з апошніх колаў агляду ў Беларусі з'явілася летам 2017 года ў Брэсце — яго ўсталявалі ў гонар надыходзячага 1000-годдзя горада. Усяго такіх атракцыёнаў у нашай краіне пяць.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Фотаконкурс

Намінацыя «Прыгажосць мацярынства»

Фота Вольгі ПІНЧУКОВАЙ *(Магілёў).*

Намінацыя «Разам працуем — разам адпачываем»

Фота Ірыны КАЗЛОВАЙ *(Гомель).*

Газета «Звязда» сумесна з Міністэрствам інфармацыі праводзіла рэспубліканскі творчы фотаконкурс «Шчаслівая сям'я». Даслаць свае здымкі і падзяліцца ўсмешкамі татаў, мам і дзяцей маглі як прафесійныя фатографы, так і аматары. Усяго на конкурс паступіла каля 250 работ. На старонках «Сямейнай газеты» друкуем найлепшыя з іх.

Мамін дзённік

А што ўмее тваё дзіця?

Стаўшы маці, я даведалася, што дзіця — тваё і любое іншае — павінна ўпісвацца ў кімсьці прыдуманыя рамкі. Самастойна трымаць галаву ў тры месяцы, сесці ў паўгода, а ў васьмімесячным узросце ўвогуле гаварыць складамі!

Калі майму Цёміку споўніўся месячык, я павезла гэты маленькі кулёчак да неўролага. Відавочных прычын на тое не было. Такі цяпер парадак: у месячным узросце немаўля павінна пабываць на прыёме не толькі ў згаданага спецыяліста, а і ў артапеда, акуліста і, уявіце сабе, сесці ў... стаматалагічнае крэсла. На руках мамы, вядома.

Прыехалі мы ў медыцынскі цэнтр (у нашай сталічнай дзіцячай паліклініцы — ніводнага неўролага!). За дзвярыма з адпаведнай шыльдай сустрэла ветлівая жанчына ў белым халаце. Пастукала малаточкам па маленькіх ручках-ножках, пазвінела бразготкамі перад носікам, папрасіла малога ёй усміхнуцца... І сцеражы Бог, каб Цёмік не выканаў бы хоць адну з яе просьбаў: адпаведны дыягназ, відавочна, з'явіўся б у толькі што заведзенай картцы.

Можна ўявіць, як я хвалявалася, калі маё дзіця ў паўгода яшчэ не сядзела. Трывога прайшла амаль у сем месяцаў. У адзін дзень Арцёмка не толькі сеў, а і папоўз (дагэтуль яму падабаўся выключна задні ход), і нават, чапляючыся за парэнчы свайго ложачка, стаў на ножкі. І тут урачы былі незадаволеныя — рана.

Абсадзіць мне сваё «верацяно», вядома, не ўдалося. Устаўшы на ножкі, Цёмік зразумеў, што свет значна большы, чым яму здавалася дагэтуль, і з задавальненнем, хоць і цаной пабітага лба ды прыціснутых пальцаў, пачаў яго асвойваць: адчыняць шафкі, выцягваць з разетак прыборы, цягнуць у рот правады, выкідваць з паліц кнігі і іншыя, на яго думку, непатрэбныя рэчы.

Аказваецца, у васьмімесячным узросце дзіця не павінна прачынацца больш як тры разы за ноч. Што толькі ні рабіла, каб хоць крыху скараціць сыночкавыя, а адпаведна, і мае начныя пад'ёмы. Укладвала раней спаць, забараняла родным бударажыць Арцёмку перад сном, карміла на ноч кашай (думала, што малачком не наядаецца), накрывала-раскрывала, спецыяльным сродкам мазала дзясны, з якіх вылазяць зубкі... Безвынікова. Магчыма, сітуацыю выправіла б таблетка «Гліцыну», як рэкамендуюць некаторыя ўрачы, але здаровы сэнс перамог.

Чаго толькі не пішуць наконт таго, што павінна ўмець дзіця ў канкрэтным узросце, чым яно павінна харчавацца і якое слова сказаць першым (у нашым выпадку гэта «баба»). Размовы матуль малалетніх дзяцей часам увогуле нагадваюць спаборніцтвы: да таго дайшло, што хваляцца, калі малое самастойна сходзіць на гаршчок.

Напэўна, і гэта важна. Толькі ў пагоні за чарговым «дасягненнем» свайго маленства мы забываемся, што ўсе дзеці, як і мы, дарослыя, абсалютна розныя. Няхай малое расце так, як патрабуе ад яго прырода (не без фанатызму, канешне!). А мы будзем назіраць за чарговымі справамі і ўчынкамі сваіх нашчадкаў, а не думаць пра некім прыдуманыя рамкі.

Вераніка КАНЮТА.

Парады вопытнага гаспадара

Правяраем свае запасы!

Захаваць на ўсю зіму без страт сушаныя садавіну, ягады, грыбы для кожнай гаспадыні або гаспадара справа быццам бы звыклая. Але гэта толькі на першы погляд здаецца так проста. Нават добра высушаныя плады (яблыкі, грушы і грыбы) патрабуюць пастаяннага кантролю. Сухое, прахалоднае месца, якое добра праветрываецца — гэта гарантыя таго, што сушаным садавіне і ягадам забяспечылі патрэбныя ўмовы для зімоўкі. А вось у закрытых шафах і каморках, дзе ў зімовы час адсутнічае належная вентыляцыя, захоўваць сушаныя прадукты са свайго сада і агарода не варта. Багацце сушаных пладоў абавязкова можа сапсаваць ягадная або яблычная моль і іншыя шкоднікі. Калі дзесьці будуць выяўленыя такія «аб'ядалы», то неабходна неадкладна перабраць свае запасы. А затым, рассыпаўшы на блясе тонкім пластом, яшчэ раз прагрэць і асвяжыць яблыкі або грушы на працягу 30—40 хвілін пры тэмпературы не ніжэй +70—75 градусаў. Але не запячы! Можна будзе таксама прамарозіць прыпсаваныя сушаныя ягады, яблыкі і грушы пры тэмпературы -10—15 градусаў. (Мы такое дзеянне практыкуем на сваёй дачы). А вось калі сушаныя прадукты (ягады і садавіна) стануць пры доўгім захоўванні вільготнымі навобмацак ці пачнуць пакрывацца цвіллю, неабходна не толькі па новай прасушыць іх на печы або ў духоўцы, але і памяняць мяшочкі або папяровыя пакеты, у якіх усё гэта захоўвалася. Чарніцы, чорную парэчку і суніцы мы ў большай частцы замарожваем, а нейкую частку закатваем у слоікі. Але зімой, і часцей за ўсё, у лютым, я абавязкова дастаю і правяраю нашы запасы.

А наогул, лепш за ўсё сушаныя плады захоўваць у шчыльна закрытых слоіках з цёмнага шкла або ў тых жа палатняных мяшэчках, якія спатрэбяцца і ў наступным годзе. Дарэчы, 2019-ы год абяцае быць багатым на грыбы, таму што зіма ў нас сёлета выдатная, ды і снегу па ўсіх рэгіёнах краіны выпала даволі шмат! Абяцаю адзін з выпускаў прысвяціць грыбной тэме, у якой падкажу, дзе і ў якіх месцах у нашым рэгіёне можна будзе ўжо ў ліпені збіраць баравікі. Да наступнай сустрэчы!

Яўген САЛАНОВІЧ, дачнік са шматгадовым вопытам.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ!

ШАРЛОТКА З КАПУСТАЙ

Спатрэбіцца: *мука — 200 г, кефір — 150 мл, маянэз — 100 мл, яйка — 3 шт., сода — 0,5 ч. л., капуста белакачанная — 0,5 кг, морква — 1 шт., соль на смак.*

Змяшаць яйкі, кефір, маянэз, соль, соду і муку — атрымліваецца цеста як на аладкі.

Капусту здрабніць і пасмажыць на патэльні з морквай, пасаліць і апырскаць воцатам ці сокам лімона. Калі капуста стане мяккай, начынка гатовая.

Дно формы заслаць паперай або прамазаць алеем і пасыпаць мукой. Выкласці на дно меншую палову цеста, разраўняць. Выкласці роўным пластом капусту, зверху заліць астатнім цестам. Адправіць у папярэдне разагрэтую духоўку, выпякаць да залацістага колеру.

ХУТКАЯ СКУМБРЫЯ

Спатрэбіцца: *скумбрыя — 3 шт., цыбуля — 3 шт., соль — 3 ст. л, цукар — 1 ст. л, алей — 130 мл, воцат 9 % — 100 мл, вада — 250 мл, кроп, перац чорны молаты, лаўровы ліст.*

Рыбу разабраць, выдаліць галаву, вантробы і чорную плевачку ў брушку.

Нарэзаць. Выкласці ў ёмістасць слой рыбы, пасыпаць сумессю солі і цукру, дадаць крыху молатага перцу, лаўровы ліст. Дадаць слой цыбулі паўколамі, пасыпаць кропам. Далей зноў слой рыбы.

Змяшаць воцат, алей, ваду (кіпячоную, астылую). Заліць гэтай сумессю рыбу, прыняць у халадзільнік. Праз чатыры гадзіны можна каштаваць.

УМЕЛЫЯ РУЧКІ





«ЯКІ РОД, ТАКІ І ПЛОД» (Беларуская народная прыказка).

НЕ ХАПАЕ ТОЛЬКІ ГУСІ Ў БРОНЗЕ

Як гусі на санках каталіся

Пакуль едзем са старшынёй Беладубраўскага сельсавета Мікалаем Кажамякіным на месца, размаўляем пра свойскую жывёлу. Святы Апанас ахоўвае не толькі гусей, але і ўсіх астатніх гадаванцаў. Дарэчы, кароў у Белай Дуброве таксама болей чым дзе па сельсавеце — 29. І гэта амаль на 600 жыхароў. Але гусей на душу насельніцтва ўсё роўна атрымліваецца болей. Аграгарадку Белая Дуброва пашчасціла з рэчкамі, прырода сама стварыла ўсе ўмовы для гусінай «дзейнасці».

Людміла Стральцова з задавальненнем знаёміць са сваёй немаленькай, як на цяперашнія часы, гаспадаркай.

— Дзве каровы, свінні, куры, гусі, качкі, — пералічвае яна і ўдакладняе: — Гусей трымала ўсё жыццё, ад бабкі, а потым і маці пераняла традыцыю. Чаму не трымаць? Рэчка побач, а што яшчэ гусям трэба?

Зараз у Людмілы Іванаўны два гусакі і чатыры гускі. Гэта, тлумачыць, на семя. Гускі хутка пачнуць несці яйкі, потым будуць выседжваць гусянят. Якім будзе патомства, казаць пакуль рана. Было і па 60 штук, а летась вылупілася 19. На некалькі месяцаў наперад забяспечыла сябе гусіным мясам і тлушчам. А апошні, як вядома, лекавы сродак. І добра ратуе ад марозу. «Вось тыя салдаты, што ў Маскве ў карауле на Краснай плошчы стаяць, зімой твар змазваюць гусіным тлушчам, каб не абмарозіць, — з веданнем справы кажа жанчына. — На сто працэнтаў ратуе. А яшчэ добры пры апёках і ўдарах. Абмыў рану пад праточнай вадой, намазаў — і парадак. Хутчэй загойваецца і скуру не цягне. А калі кашаль або бранхіт, трэба грудзі намазаць, і хвароба хутка пройдзе. Цёплая коўдра таксама добрае лякарства. Шыю з пер'я і коўдры, і падушкі. Нават на заказ. Было неяк, жыхар Санкт-Пецярбурга заказваў».

Успомніла яна і кур'ёзны выпадак са свайго жыцця. Аднойчы ў снежні зляцелі гусі са двара ў луг, Іванаўна паспрабавала гнаць дадому, а яны па снезе ісці не жадаюць. Прыйшлося тэлефанаваць дамоў, выклікаць дзяцей з санкамі. У мяшок гусей пасадзілі і павезлі дахаты.

Зімовыя купанні

Пакуль размаўлялі, падышла яшчэ адна суседка Людміла Аляксейчанка.

— У мяне тры гусі і сем качак, — дае яна справаздачу. — Кожны дзень гуляюць на рэчцы. Яна трымае яшчэ трусоў розных пародаў. Адны з іх «баранамі» завуцца за занадта пушысты «чуб». Не бяда

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Гадаванцы Людмілы АЛЯКСЕЙЧАНКІ.

нават, калі збягуць з клеткі, сабака Топка вушастых кантралюе. А гусей і наогул кантраляваць не трэба, яны птушкі разумныя. І ніякіх маразоў не баяцца. На вуліцы мінус 10, а ім хоць бы хны.

— Гусям не холадна, іх тлушч грэе, нават у маразы любяць пакупацца. Трэба толькі сачыць, каб пад лёд не нырнулі. Было неяк, дзве гусі так і загінулі, толькі вясной, калі лёд на рацэ пачаў таяць, знайшлі тое, што ад іх засталося, — расказвае Людміла Стральцова.

Суседкі ачыняюць хлявы і праводзяць птушыных на купанні. Смешна назіраць збоку, як чырвоныя лапкі спрытна мільгацяць па заснежанай сцежцы. А калі з-за соснаў паказваецца Беседзь, яны і зусім пераходзяць на галоп, дапамагаючы крыламі. Вось аматары прыняць водныя працэдуры!

Цешанькі, це-це-це — звыклы кліч, якім гаспадыні заклікаюць птушак, нават не дапамагае. «Пакуль не вымыюцца — бессэнсоўна зваць, — кажуць гаспадыні. — Вось калі выйдуць на лёд і пачнуць пёры чысціць, іншая справа. Паслухаюць і нават адгукнуцца».

Святы Апанас пакараў

Соф'я Яфрэменка адна з тутэйшых старажылак. Гусямі займаецца колькі сябе памятае. І Святога Апанаса вельмі шануе. У гэты дзень, папярэджвае, нельга нічым сур'ёзным займацца, а вось гусям трэба ўсе знакі ўвагі аказваць, каб яны не пакрыўдзіліся.

— Да вайны адзін тутэйшы жыхар на свята стаў клеіць крэсла, вось у яго ўсе гусі і перавяліся, — расказвае яна павучальную гісторыю. — Нарадзіліся са зрошчанымі лапкамі. Прапалі, адным словам.

У Соф'і Лаўрэнцьеўны з гусямі ніколі праблем не было — і па 30, і па 40 штук нараджалася. Ёй хутка 85 гадоў, а гусі і зараз на двары гагочуць. І не толькі гусі. Ёсць і карова, і парсючок, і куры. Навошта такая вялікая гаспадарка? А хто ўнукам дапамагаць будзе? А так

❍ На заметку

Гусі вельмі добрыя вартаўнікі. Калі нехта пройдзе, пачынаюць гагатаць. Сігналізуюць лепей за сабаку.

Калі гусь на адной назе, значыць, быць маразам.

Калі гусь пачынае купацца, чакай пацяплення.

гусь за трыццаць рублёў прадаў, вось табе і прыбытак. Ды і стравы смачныя атрымліваюцца. Адзін халадзец чаго каштуе. Але пра гэта асобна пагаворым.

Чаму гусей у Белай Дуброве стала меней? «Лянівыя мы сталі, — лічыць Лаўрэнцьеўна. — За імі ж глядзець трэба, розныя ворагі на іх нападаюць — і птушкі, і жывёлы. Потым перажываеш».

З яблыкамі і капустай

Гусямі, лічаць у вёсцы, займацца — любата. Летам наогул корму ідзе мінімум — ім і травы хапае. Увечары зерня крыху клюнулі — і на супакой. А раніцай зноў «на вольныя хлябы». Зімой харчаванне больш каларыйнае, але і гэта невялікія страты. «Калі гусей шмат, даход будзе добры, — лічаць суразмоўнікі. — Можна шмат тушонкі нарыхтаваць. Гэта ж смаката».

— Мне, напрыклад, вельмі падабаецца бульба на гусіным тлушчы, — смачна расказвае Людміла Стральцова. — А яшчэ суп гарохавы з гусяцінай. Калі дабавіць ячнай крупы і фасолі, наогул атрымліваецца цудоўна. А гусі з чарнаслівам або квашанай капустай — такая смаката, што за вушы не адцягнеш. А яшчэ з бульбай можна або рысам ці яблыкамі. Дадаў солі, перцу, крыху вады — і ў печку ці ў духоўку. Найлепшая страва на любое свята.

Аляксандр і Людміла Аляксейчанкі таксама шмат ведаюць смачных страў з гусяціны. Людміла прызнаецца, што гусямі займаецца не так даўно — гадоў пяць. Раней далёка ад рэчкі жыла, потым у Касцюковічах, а з тых часоў, як выйшла на пенсію і пераехала бліжэй да Беседзі, занялася гусямі. Мяса і пер'е каштуюць нямала. Вунь пашыла ўнучцы коўдру. Цёплая як печка. А тлушч гусіны — ад шматлікіх хвароб ратуе. Адной жанчыне з хворымі нагамі масаж з ім робяць — дапамагае. А яшчэ заўважалі, што скура ад звычайных крэмаў сохне, а ад гусінага тлушчу не.

Святыя ахоўнікі Белай Дубровы

У Грэцыі, Малой і Сярэдняй Азіі гусі лічыліся святымі птушкамі, іх таксама атаясамлялі з багаццем. Згадваюцца яны і ў Адысеі. Памятаеце, у Пенелопы было 12 гусей і яна любіла назіраць, як яны ядуць намочанае зерне. Для рымлян гусі наогул ратавальнікі, якія дапамаглі пазбегнуць смерці, загагаталі, калі каварныя галы хацелі іх знішчыць. І хаця Белая Дуброва не Грэцыя і нават не Рым, шануюць тут гэтых сімпатычных птушак ніяк не меней. Цікавы фестываль прыдумалі.

Антаніна ЦЫГАНКОВА, загадчыца Беладубраўскага дома культуры, сведчыць:

— Гэта свята не магло не нарадзіцца. Тут спрадвеку гусей гадавалі, клапаціліся, каб патомства было добрае. Гэтыя традыцыі мы ў аснову свята і паклалі. Месцамі, праўда, крыху перабольшылі, але ж толькі для таго, каб цікавей было. Напрыклад, прыдумалі, што гусей для адкорму зашывалі ў парусінавыя мяшкі, з якіх тарчалі адны галовы, а ў дзюбу ставілі варонку і закідвалі зерне і арэхі. На самай справе было прасцей. Гусей сапраўды саджалі ў асобныя скрыні і кармілі «далікатэсамі» — канюшынавай і льняной мякінай, якую спецыяльна збіралі на палях. Калі корм добры, тады і плоднасць павышаецца, гусянят нараджаецца болей.

Свята гусінае для аграгарадка — падзея касмічнага маштабу. Якіх толькі іспытаў для сваіх гадаванцаў мясцовыя не прыдумвалі. Гонкі, напрыклад, ладзілі, стаўкі рабілі. Чыя гусь хутчэй прыбяжыць, таму і прыз. «Я нават прыгожы кубачак выйграла», — усміхаецца Людміла Аляксейчанка. Гусям і капялюшыкі надзявалі, і банты прывязвалі. Людзей было шмат, усім спадабалася.

— Са сваім гусіным святам мы ўжо аб'ездзілі ўсю Беларусь. І кожны раз нешта новае дадаём, — расказвае Антаніна Цыганкова. — Асноўны наш сімвал — запечаная гусь. Варым крупу, перакручваем звараныя вантробы і напаўняем тушку. Смаката.

Пакуль, праўда, у раёне канчаткова не вызначыліся, калі свята праводзіць. Рабілі ў канцы лютага, але гэта не зусім зручна. Гускі якраз толькі рыхтуюцца да таго, каб абзаводзіцца патомствам. Спачатку яйкі нясуць, потым садзяцца, а там ужо і гусянят нядоўга чакаць. Калі малыя выведуцца, гусям наогул не да свята. Ды і на выгляд не вельмі — худыя. За лета тлушч нагуляюць, за восень да кандыцыі дойдуць, а ў снежні можна і свята рабіць, лічаць гаспадыні.

Старшыня сельскага Савета Мікалай КАЖАМЯКІН вывучае магчымасць паставіць у аграгарадку помнік птушцы. Ён і зараз ёсць, але ж зроблены сваімі сіламі з цэменту. А хацелася б, каб было нешта больш істотнае і сур'ёзнае.

— Наогул у Белай Дуброве шмат працавітых людзей жыве. Напрыклад, па сельскім Савеце ў нас 46 кароў, з іх у Белай Дуброве — 29, шмат хто здае малако дзяржаве, — адзначыў Мікалай Кажамякін. — Гусі — гэта таксама дадатковы заробак. А галоўнае, людзі пры справе. На вёсцы чаму

Хлебам не кармі, дай пакупацца.

співаюцца? Ад гультайства. А калі ёсць гаспадарка, не да выпіўкі.

Дарэчы, што датычыцца гусей. Тут яшчэ і выхаваўчы момант прысутнічае. Летась наша школьніца Вольга Прымакова падрыхтавала публікацыю пра гусінае свята, якая выйшла ў адной з цэнтральных газет. Дзяўчына ж атрымала пуцёўку ў лагер «Зубраня», дзе таксама прэзентавала фестываль. А яе работа, прысвечаная гусям, перамагла ў рэспубліканскім конкурсе «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся».

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ЗДАРЭННІ

Светла-блакітная смерць у кубку

Два чалавекі ў Барысаўскім раёне памерлі пасля ўжывання шклоачышчальнай вадкасці.

Па інфармацыі Следчага камітэта, раніцай ад медработнікаў паступіла паведамленне пра смерць 33-гадовага мужчыны, а таксама шпіталізацыю 44-гадовага мужчыны і яго жонкі з прыкметамі атручэння метылавым спіртам.

Па звестках следства, напярэдадні вечарам усе трое знаходзіліся ў прыватным доме ў вёсцы Палялюм. Там яны пілі нейкую вадкасць. На наступны дзень муж і жонка былі дастаўлены ў бальніцу, дзе мужчына памёр. Смерць другога была канстатавана ў доме, дзе ён часова пражываў. Жанчына знаходзіцца ў рэанімацыі. Следча-аператыўная група апытала мясцовых жыхароў. Канфіскавана паліморная пяцілітровая бутэлька са светла-блакітнай вадкасцю, а таксама кубкі з яе рэшткамі. Прызначана экспертыза на прадмет устанаўлення атрутных рэчываў, дакладнай прычыны смерці грамадзян і іншых абставін.

Хлопчык выпіў сродак для мыцця

Па інфармацыі Следчага камітэта, здарэнне адбылося яшчэ 11 студзеня.

У адным з населеных пунктаў Столінскага раёна аднагадовае дзіця выпіла сродак для мыцця. У выніку яго самаадчуванне рэзка пагоршылася. Хлопчык быў шпіталізаваны, яму аказалі медыцынскую дапамогу. Цяпер яго жыццю нічога не пагражае. Праводзіцца праверка. Апытаныя члены сям'і хлопчыка, прызначана судова-медыцынская экспертыза. Следчыя нагадваюць пра тое, што нельга пакідаць дзяцей без нагляду. «Захоўваць бытавую хімію трэба ў месцах, недаступных для малых. Толькі ўважлівасць дарослых можа абараніць дзіця ад небяспекі».

«Пераблытаў» лася з зайцам

У паляўнічых угоддзях каля вёскі Дубраўка ў Асіповіцкім раёне дзяржінспектары заўважылі на снезе сляды трох чалавек, што вялі ад месца, дзе спыніўся аўтамабіль, углыб лесу. Рухаючыся па іх, рэйдавая група выйшла да месца здабычы лася — там знайшліся рэшткі капытнага.

Паколькі паляванне на ласёў забаронена, сумненняў у браканьерстве ў дзяржінспектараў не было. Пад падазрэнне трапілі тры мясцовыя паляўнічыя. У дачным доміку аднаго з іх знайшлі мяса і рогі лася. На наступны дзень мужчына прыйшоў з пакаяннем: прызнаўся, што падстрэліў сахатага, маючы пуцёўку на пушнога звера. Браканьер ужо пакрыў шкоду ў памеры больш за 10 тысяч рублёў. У адносінах да астатніх падазраваных праводзіцца праверка. Заведзена крымінальная справа.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Открытое акционерное общество «Управление механизации № 79» извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, проводимых на электронной торговой площадке «ТОРГИБЕЛ»

№ лота	Описание предмета электронных торгов	Начальная цена с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Задаток, бел. руб.
290119001	Башенный кран КБ-403 (заводской № 1890, год выпуска – 1987)	43 200,00	4 400,00
290119002	Башенный кран КБМ-401 УХЛ-24 (заводской № 4, год выпуска – 2007)	73 700,00	7 400,00
290119003	Автомобиль (самосвал) МАЗ 5551А2 (инвентарный № 5196, год выпуска – 2008)	14 400,00	1 500,00
290119004	Автомобиль (самосвал) МАЗ 555102 6300-2 (инвентарный № 4079, год выпуска – 2009)	14 400,00	1 500,00
290119005	Трактор Т25 23-10 (инвентарный № 2025, бывший в употреблении)	2 160,00	220,00

Местонахождение предметов торгов: г. Минск, ул. Селицкого, 27А.
Шаг электронных торгов – 5 %

УСЛОВИЯ

1. Победитель электронных торгов (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Предмета (Предметов) электронных торгов по истечении 10 (десяти) банковских дней с момента определения Победителя электронных торгов (Претендента на покупку).
2. Победитель электронных торгов (Претендент на покупку) должен оплатить Продавцу стоимость приобретенного на электронных торгах Предмета (Предметов) электронных торгов в течение 10 (десяти) банковских дней после подписания договора купли-продажи.
3. Победитель электронных торгов (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору электронных торгов стоимость затрат на организацию и проведение электронных торгов на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя электронных торгов.
5. Победитель электронных торгов (Претендент на покупку) – нерезидент Республики Беларусь оплачивает стоимость приобретенного на электронных торгах предмета электронных торгов в российских рублях, долларах США (по соглашению сторон) по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату, оговоренную в договоре купли-продажи. Ставка налога на добавленную стоимость при продаже предметов электронных торгов нерезиденту Республики Беларусь (экспорт) в соответствии с Налоговым кодексом Республики Беларусь устанавливается в размере ноль (0) процентов

Дата и время начала проведения электронных торгов: 1 марта 2019 года в 10.00 (по времени на ЭТП «ТОРГИБЕЛ»)

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом ЭТП «ТОРГИБЕЛ» с соблюдением требований Положения о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков», утвержденных постановлением Совета Министров РБ № 608 от 12 июля 2013 г.
Продавец: ОАО «УМ № 79», 220075, г. Минск, ул. Селицкого, 27А, тел./факс (+375 17) 344-61-23, (+375 29) 179-00-50.
Организатор электронных торгов: ОАО «УМ № 79», 220075, г. Минск, ул. Селицкого, 27А, тел./факс (+375 17) 344-61-23, (+375 29) 179-00-50.
Оператор электронной торговой площадки: РУП «Институт недвижимости и оценки» 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, тел. 8 (017) 306-00-57.
Электронный адрес ЭТП: http://торги.бел.
Задаток перечисляется на р/с BY68BPSB30121543370789330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», BIC банка BPSBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в электронных торгах по продаже имущества, принадлежащего ОАО «УМ № 79» (Лот № _____), проводимых 1 марта 2019 г. Перечисление задатка производится не позже срока окончания приема документов на участие в электронных торгах – 26.02.2019 г. Лицо, желающее принять участие в электронных торгах в отношении нескольких предметов электронных торгов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов.
Аккредитация, регистрация и участие в электронных торгах осуществляется на ЭТП «ТОРГИБЕЛ».
Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами: 26.02.2019 г. в 11.00.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Предметами. Контактное лицо для осмотра Предметов электронных торгов – Грудько Николай Адамович, тел. +375 (29) 179-00-50, Ваврук Артем Александрович, тел. +375 (29) 179-11-87. Детальная информация о порядке участия в электронных торгах размещена на сайте ЭТП «ТОРГИБЕЛ» (http://торги.бел.)

Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении открытого аукциона 05.03.2019

Лот № 1. Капитальное строение с инв. № 722/С-4290 – здание заправочной станции, площадь – 6,7 кв. м, составные части и принадлежности: одноэтажное блочное здание заправочной станции с ограждением, воротами, адрес: Могилевская обл., Круглянский р-н, г. п. Круглое, ул. Кутузова, 6А/1. **Капитальное строение с инв. № 722/С-4291 – здание гаража,** площадь – 451,0 кв. м, адрес: Могилевская обл., Круглянский р-н, г. п. Круглое, ул. Кутузова, 6А. **Капитальное строение с инв. № 722/С-4292 – проходная,** площадь – 7,0 кв. м, составные части и принадлежности: здание проходной с отмосткой, дворовое покрытие, бортовой камень, ворота с калиткой, три ограждения; адрес: Могилевская обл., Круглянский р-н, г. п. Круглое, ул. Кутузова, 6А. **Капитальное строение с инв. № 722/С-4293– здание склада**, площадь – 32,0 кв. м; адрес: Могилевская обл., Круглянский р-н, г. п. Круглое, ул. Кутузова, 6А/2. **Электрические сети инв. № 68001,** тип кабеля АВВГ 3х25+1х16 кв. м, протяженность – 200 м. **Сведения о земельном участке:** лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 724255100001001524, площадь – 0,6518 га, целевое назначение – земельный участок для обслуживания производственных зданий, расположен по адресу: Могилевская обл., Круглянский р-н, г. п. Круглое, ул. Кутузова, 6А, предоставленном на праве постоянного пользования.
Начальная цена продажи: 88 687,63 бел. руб. с учетом НДС (20 %).
Сумма задатка: 8 868,76 бел. руб.

Аукцион состоится 5 марта 2019 года в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Последний день подачи заявок и внесения задатка: 4 марта 2019 года до 15.00. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее чем за три дня до даты аукциона

Продавец: ОАО «Агросервис», УНП 700010487, г. Могилев, ш. Славгородское, 44а, тел. 73-57-84

Организатор аукциона: Могилевский филиал РУП«Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская,77, к. 352

Расчетный счет для внесения задатка: Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

Порядок проведения аукциона: для участия в аукционе приглашаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, которые внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, своевременно подали заявление на участие в аукционе со всеми необходимыми документами, заключили с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон. Лот продается без условий на открытом аукционе с применением метода повышения начальной цены, с шагом пять процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. Единственный участник имеет право приобрести объект продажи по начальной цене, увеличенной на 5 %

Срок и условия оплаты: победитель аукциона уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона, включающее в т. ч. и затраты на организацию аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Продавец и Победитель аукциона обязаны в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата за предмет аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи

Дополнительную информацию можно получить по тел.: +375 222 72-41-14, +375 29 624-26-25. Mogilev@ino.by

КХ Нехведовича И. И.
КУПЛЮ **РАСУ** Ў ЛЮБЫМ СТАНЕ
+375 29 6206517 УНП 600032885

5 марта 2019 года в 13.00 состоится очередное общее собрание акционеров «ОАО «Элегант».
ПОВЕСТКА ДНЯ:
1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности общества за 2018 год и основные направления деятельности общества в 2019 году.
2. Отчет наблюдательного совета общества.
3. Утверждение годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности общества за 2018 год.
4. О выплате дивидендов и утверждение распределения прибыли и убытков общества за 2018 год.
5. Утверждение основных направлений использования прибыли в 2019 году и первом квартале 2020 года.
6. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.
7. О материальном вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии общества.
Место нахождения ОАО «Элегант»: г. Гомель, ул. Интернациональная, 13-1.
Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Интернациональная, 13-1.
Время регистрации участников собрания в день проведения собрания с 12.30 до 13.00 по предъявлении документа, удостоверяющего личность (для представителя акционера – доверенность).
Список акционеров для участия в собрании будет составлен на основании реестра акционеров по состоянию на 12 февраля 2019 г.
Акционеры могут ознакомиться с материалами по вопросам повестки дня собрания в рабочие дни с 11.00 до 13.00, начиная с 12.02.2019 г., по месту нахождения общества.
Наблюдательный совет. УНП 400078331

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомсельмаш» (продавец) извещает о проведении 21 февраля 2019 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной стоимости на 80 % в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
1	**Капитальное строение с инв. № 350/С-82121**, **площадью 705, 3 кв. м,** назначение – здание многофункциональное, наименование – **здание административно-производственное. Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000003000775,** площадь **0,1639 га** – для эксплуатации и обслуживания здания административно-производственного **(право аренды).** Местонахождение: **г. Гомель, ул. Рабочая, д. 7. Капитальное строение с инв. № 350/С-159313**, **площадью 0,0 кв. м, протяженность – 33,8 м,** назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – **канализационная сеть.** Адрес: **г. Гомель, ул. Рабочая, 7, участок канализационной сети от КК-1 до КК-3. Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000003002781** (присвоен предварительно). **Капитальное строение с инв. № 350/С-160641**, **площадью 0,0 кв. м, протяженность – 37,8 м,** назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – **тепловая сеть.** Адрес: **г. Гомель, тепловая сеть от административного здания до зданий мастерских и складов по ул. Рабочая, 7. Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000003002820** (присвоен предварительно). **Капитальное строение с инв. № 350/С-159320**, **площадью 0,0 кв. м, протяженность – 63,6 м,** назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – **линия электропередачи.** Адрес: **г. Гомель, линия электропередачи от ТП-828 до здания по ул. Рабочая, 7. Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000003002787** (присвоен предварительно). Гараж металлический 3,2х6 (инв. № по бух. учету 426), стеллаж металлический закрытый для хранения труб (инв. № по бух. учету 669), стеллаж металлический закрытый для хранения труб (инв. № по бух. учету 670), здание металлическое для отрезного станка (инв. № по бух. учету 672)	**126 958,44**	6 347,92
2	**Капитальное строение с инв. № 350/С-163045**, площадью **457,7 кв. м,** назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – **здание специализированное розничной торговли (магазин).** Информация о земельном участке: кадастровый номер **340100000003003043,** общая площадь **0,0538 га** – для эксплуатации и обслуживания здания специализированного розничной торговли (магазин**) (право аренды).** Местонахождение: **г. Гомель, ул. Шоссейная, 41В**	**91 440,00**	4 572,00
3	**Капитальное строение с инв. № 350/С-82143**, площадью **1 348,5 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **административное здание.** Информация о земельном участке: кадастровый номер **340100000003000777,** общая площадь **0,0588 га** – для эксплуатации и обслуживания здания административно-хозяйственного **(право аренды). Местонахождение:** г. Гомель, ул. Рабочая, 17. **Ограничение (обременение):** договор аренды сроком по 26.11.2022 г., общая площадь, сданная в аренду, – **88,1 кв. м**	**216 720,00**	10 836,00

Продавец: ОАО «Гомсельмаш», г. Гомель, ул. Шоссейная, 41. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (0232) 59-23-93 – Мойсеенко Наталья Александровна. **Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** P/c BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (указать № лота) **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)**; **2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 31 января 2019 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. **Прием заявлений (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов) для участия в аукционе заканчивается 19 февраля 2019 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **30 (тридцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 07.08.2018 г. (лоты №№ 1, 2) и 28.08.2018 г. (лоты №№ 3, 4). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: (тел./факс) 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62**

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор конкурса) по поручению Коммунального производственного унитарного предприятия «МебельДревТорг» (продавец), в лице управляющего в деле о банкротстве – директора частного предприятия «Эффективное Управление» Лукашева Д. Л. извещает о проведении 15 февраля 2019 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной цены на 80 % (лот № 1–5), на 30 % (лот № 6–10), в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, без учета НДС (20 %), бел. руб.	Шаг аукциона – 5 %, бел. руб.	Сумма задатка, без учета НДС (20 %), бел. руб.
	Местонахождение лотов №№ 1–10: Гомельская обл., Хойникский р-н, г. Хойники, ул. Берегового, д.1А. **Условия продажи (лоты №№ 2–6, 8–10): 1.** Претендент на покупку (победитель) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств, а также в случае необходимости получение регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за их счет и их силами. **3.** Земельный участок под объект продажи (лот № 1, 7) будет выделен по заявке нового собственника, согласно законодательству РБ. **4.** В соответствии с действующим Законодательством РБ (в части изменения подпункта 2.30 пункта 2 статьи 115 в Налоговом кодексе РБ с 1 января 2019 года) реализация имущества осуществляется без учета НДС 20 %			
1	**Капитальное строение с инв. № 343/С-37185 общей площадью 288,8 кв. м,** назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – **пилорама. Капитальное строение с инв. № 343/С-37184 общей площадью 3 532,5 кв. м,** назначение – здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование – **деревообрабатывающий цех. Составные части и принадлежности согласно данных технического паспорта:** тамбур (литер Б 1/к); пристройка (литер1А 2/кн); административное (литер А 2/кн); котельная (литер В 1/кн); сушилка (литер Г 1/кн); пристройка (литер Д 1/кн); склад с рампой (литер Е1/кн); склад (литер Ж 1/кн); гараж (литер И 1/кн); тамбур (литер 1); навес (литер 2); навес (литер 3); навес (литер 4); крыльцо (литер а); крыльцо (литер б); крыльцо (литер в); крыльцо (литер г); площадка (литер д); крыльцо (литер е); отмостка (литер ж); уборная (литер 5); уборная (литер 6); ворота и калитка (литер З); забор (литер и); забор (литер к); навес (литер 7). Информация о земельном участке: кадастровый номер **325450100002000001** площадью **3,3685 га** – для содержания и обслуживания производственных зданий и сооружений **(право постоянного пользования)**. **Местонахождение:** Гомельская обл., Хойникский р-н, г. Хойники, ул. Берегового, д. 1А	**71 647,20**	3 582,36	7 164,72
2	Ковш ПФС-0,75-1 (0,4 куб. м), инв. № 13070003	**20,00**	1,00	2,00
3	Станок кромкооблицовочный, инв. № 13070000	**2 060,00**	103,00	206,00
4	Котел Е-1,0/0,9Р, инв. № 13040006	**980,00**	49,00	98,00
5	Котел водогрейный стальной К-95, инв. № 13070001	**1 680,00**	84,00	168,00
6	**Автомобиль ВАЗ-2107**, год выпуска 2004, рег. № 5881 АВ-3, VIN ХТА210700552055293,цвет белый, тип ТС – легковой специальный седан	**910,00**	45,50	91,00
7	**Капитальное строение с инв. № 343/С-37204**, **общей площадью 28,0 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **проходная.** Информация о земельном участке: кадастровый номер **325450100002000001** площадью **3,3685 га** – для содержания и обслуживания производственных зданий и сооружений **(право постоянного пользования)**. **Местонахождение:** Гомельская обл., Хойникский р-н, г. Хойники, ул. Берегового, д. 1А	**3 290,00**	164,50	329,00
8	**Автомобиль ВАЗ-21070**, год выпуска 2004, рег. № 8690 АВ-3, VIN ХТА21070052059433, цвет сине-зеленый, тип ТС – легковой специальный седан	**35,00**	1,75	3,50
9	**Автомобиль ГАЗ-53-01**, год выпуска не определен, рег. № АК 4030-3, VIN б/н, цвет зеленый, тип ТС – грузовой бортовой	**1 260,00**	63,00	126,00
10	**Автомобиль ГАЗ-27-05**, год выпуска 2003, рег. № АК 5336-3, VIN ХТН27050030328523, цвет белый, тип ТС – грузопассажирский вагон	**1 330,00**	66,50	133,00

Продавец: Управляющий в деле о банкротстве КПУП «МебельДревТорг», директор частного предприятия «Эффективное Управление» Лукашев Д. Л. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.** 8 (029) 645-45-14 – управляющий Лукашев Д. Л. **Шаг торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона. Для участия в аукционе необходимо: 1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционе (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); **2**. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 31 января 2019 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 13 февраля 2019 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за один день до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником (претендентом на покупку), объекты аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается Организатором торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договора купли-продажи в течение **15 (пятнадцати) календарных дней** и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **5 (пяти) дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Законом РБ от 13.07.2012 № 415-З (ред. от 04.01.2014) «Об экономической несостоятельности (банкротстве)» ст. 127–129. **Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 21.07.2018 г. Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы» и www.bankrot.gov.by. Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62**

Кніжны свет

БЕНГАЛІЯ: НЕКТАР ДЛЯ СЛЫХУ

Паліграфічны камбінат імя Якуба Коласа выдаў унікальную кнігу: пад адной вокладкай сабраны пераклады легендарнага верша лаўрэата Нобелеўскай прэміі ў галіне літаратуры за 1913 год Рабіндраната Тагора «Мая залатая Бенгалія» на мовы народаў свету. 62 тэксты на 50 мовах — на бенгальскай і пераклады на 49 моў. Чаму 62 тэксты? На некаторыя мовы — па два і болей перакладаў.



Верш быў напісаны на самым пачатку XX стагоддзя. А ўжо ў 1970-я гады, калі з'явілася на карце свету краіна Бангладэш, твор бенгальскага, індыйскага пісьменніка стаў гімнам незалежнай і суверэннай дзяржавы. «Мая залатая Бенгалія, / Я закаханы павек. / Заўжды тваё неба, паветра / Ў душы маёй граюць на флейце. / О маці, лясы твае мангавыя / Сакавік водарам поіць, ах!» — прамаўляе Рабіндранат Тагор праз пераклад лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Міколы Мятліцкага.

Каб скласці кнігу, ідэя якой належыць беларускаму інжынеру і грамадзяніну Бангладэш Музахідулу Ісламу, які жыве і працуе ў Мінску, спатрэбілася стварыць Міжнародны рэдакцыйны савет. У яго ўвайшлі казахстанскі літаратуразнаўца Святлана Ананьева, беларуская перакладчыца Марыя Кобец, старшыня Астраханскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Расіі Юрый Шчарбакоў, публіцысты, пісьменнікі, перакладчыкі з Дагестана (Расійская Федэрацыя) Керымхан Умаханаў і Марат Гаджыеў, журналіст з Бангладэш Рыаз Хайдар. Прадмову да кнігі напісаў прадстаўнік ЮНІСЕФ у Беларусі Рашэд Мустафа Сарвар. У якасці ілюстрацыі да зборніка выкарыстаны рэпрадукцыі цыкла малюнкаў славутага бангладэшскага мастака Зайнула Абедзіна «Голад у Бенгаліі ў 1943 годзе».

Хто ж далучыўся да працы над кнігай, ахвяраваўшы свой час на пераўвасабленне твора Рабіндраната Тагора? Сярод перакладчыкаў — вядомыя ў сваіх нацыянальных літаратурах: заслужаны работнік культуры Кабардзіна-Балкарыі Саліх Гуртуеў, народны пісьменнік Удмурціі Вячаслаў Ар-Сяргі, народны паэт Чувашскай Рэспублікі Валерый Тургай, башкірка Зульфія Хананава, народны паэт Татарстана, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Расійскай Федэрацыі Рэнат Харыс, шорская паэтэса Любоў Арбачакова, марыйскі пісьменнік Генадзь Аяр-Сабанцаў... Ёсць у кнізе пераклады на такія мовы, як карэйская, кітайская, хіндзі, урду, на мовы народаў Еўропы — італьянскую, грэчаскую, польскую, сербскую, македонскую і іншыя. Ёсць пераклад нават на мову лух'я, на якой гавораць у афрыканскіх краінах Кеніі і Угандзе (па розных падліках гавораць на гэтай мове ад 5 да 10 мільёнаў чалавек). Перакладчык на лух'я — паэт Хілары Майнг.

На беларускую мову «Маю залатую Бенгалію» пераклалі Сяргей Панізнік, Надзея Салодкая, Навум Гальпяровіч, Марыя Кобец і Мікола Мятліцкі. «... Матуля, вуснаў тваіх словы / Для слыху майго — нектар, / Ах! / Матуля, калі чало тваё светлае агортвае смутак, / О родная, я слёзы глытаю», — прамаўляе Рабіндранат Тагор, захоплены прыгажосцямі роднай прасторы, ды разам з тым і занепакоены лёсам бенгальскага народа, лёсам роднай старонкі. Праз кнігу аднаго верша «Мая залатая Бенгалія» на мовах свету» нечым няўлоўным (а хіба мастацтва, паэзію можна практычна вымераць?!) Бангладэш, бангладэшцы, бенгальцы становяцца бліжэй да нашага беларускага святла, да нашых прыгожых прастораў. Дарэчы, упершыню творы Рабіндраната Тагора загучалі па-беларуску яшчэ ў 1920-я гады. Адзін з першых перакладчыкаў — народны паэт Беларусі Якуб Колас.

Застаецца заўважыць, што кніга аднаго верша Рабіндраната Тагора выйшла якраз у пярэдадзень XXVI Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу, на якую прыедуць і госці — пісьменнікі і кнігавыдаўцы з 34 краін свету.

Мікола БЕРЛЕЖ.

Вёскі, якія знікаюць: апошнія жыхары

ЯК ХУТАРЫ ЗВЕЗЛІ І СЯЛО ЎТВАРАЛІ

Ліпава Кобрынскага раёна

Па-першае, у Кобрынскім раёне два Ліпава. Адно знаходзіцца на ўсход ад Кобрына, каля Гарадца, а другое — на поўдзень, каля Дзівіна. Гаворым зараз пра дзівінскае Ліпава. А па-другое, вёска цікавая тым, што яшчэ адносна нядаўна яе наогул не было... Населены пункт утвораны недзе ў 50-х гадах, калі пачалі перасяляць хутары.

ХАТЫ ПЕРАСОЎВАЛІ ТРАКТАРАМІ

Калі б хто намерыўся, магчыма, і адшукаў бы ў дакументах былога Дзівінскага раёна прозвішча таго ўпаўнаважанага, які можа лічыцца «бацькам-заснавальнікам» вёскі. Бо менавіта ён прыехаў з райцэнтра недзе напачатку 50-х, пахадзіў туды-сюды, памераў зямлю, нарэзаў участкі і паказаў людзям, куды яны могуць перавозіць свае дамы. Так і вырасла цяперашняя вуліца Ліпава. Гэта ўсё памятае **Аляксей Фёдаравіч АЛЯСЮК,** настаўнік на пенсіі, былы дырэктар школы вёскі Старое Сяло Жабінкаўскага раёна. А нарадзіўся Аляксей Фёдаравіч на адным з ліпаўскіх хутароў.

Адзін час ён займаўся напісаннем уласнай радаслоўнай і многа даведаўся пра гісторыю малой радзімы. Вось што расказаў былы настаўнік:

— На ускрайку Ліпава можна заўважыць рэшткі былога панскага маёнтка. Маёнтак быў тыповы, з паркам, садам, аранжарэяй, вадаёмамі. Ад яго засталіся толькі старыя дрэвы. Дык вось недзе ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя памешчык ушчэнт разарыўся. Можа, за даўгі, можа, яшчэ з якой прычыны яго землі былі выстаўлены на продаж. І некаторыя з заможных сялян набывалі сабе надзелы на гэтай даволі добрай, урадлівай зямлі. Калі ў каго не хапала грошай, расійскі зямельны банк даваў пазыку — крэдыт, па-цяперашняму. Вось і мой дзед купіў 30 дзесяцін зямлі. Ён з родзічамі пераехаў на новае месца з вёскі Хадынічы, таму нас у акрузе называлі Хадынцы. За тымі, што прыехалі з вёскі Баранцы і ўтварылі хутар з шасці хат, замацавалася мянушка — Бараны. Яшчэ адзін хутар атрымаў дзіўную мянушку — Індыя. Расказваюць, што адразу пасля вайны тут працавалі палонныя немцы. І гэты хутар быў адным з самых бедных, занядбаных. Назвалі яго так германцы, бо Індыю яны лічылі бяднейшым краем у свеце. Цікава, што іншыя назвы паступова забыліся, а згаданую мясцовасць да гэтай пары ўсе называюць Індыяй.

А ў нас сталі арганізоўваць калгас, паступіла дырэктыва ўсіх звозіць з хутароў, працягвае Аляксей Фёдаравіч. У калгасах і МТСах ужо былі трактары. Памятаю, як на спецыяльных прыстасаваннях цягнулі хаты. Гэта было больш зручна, не даводзілася разбіраць зруб па бярвенні, везці драўніну, а потым складваць наноў. Прымацоўвалі вуглы да спецыяльнай рамы, і з дапамогай двух трактароў перасоўвалі хату на новае месца. Так вось і пачыналася цяперашняе Ліпава. А побач з перавезенымі дамамі ўзводзілі новыя. У гады маладосці былога дырэктара гэта была ўжо даволі вялікая вёска. Тут адкрылі пачатковую школу, будаваліся ферма, магазін. А хлопцы і дзяўчаты таго пакалення імкнуліся атрымаць адукацыю. Паступалі ў тэхнікумы, інстытуты. Ну і з'язджалі з роднай вёскі.

«Цяпер у Ліпаве засталося шэсць сталых жыхароў, пяць жанчын і адзін мужчына», — расказвае **былая стараста вёскі Алена ТРУЦЬКО.** Алена Іванаўна прыехала ў вёску ў канцы 70-х гадоў. Пераехала з Бярозаўскага раёна з сям'ёй. Заатэхнік па спецыяльнасці, яна ўладкавалася працаваць загадчыцай фермы, пазней стала брыгадзірам комплекснай брыгады, у якую ўвайшла ферма. Дарэчы, ферма была адна з самых перадавых у калгасе. Тут людзі надзвычай працавітыя. Можа, дала пра сябе знаць хутарская жылка. Куплялі зямлю, абзаводзіліся сваёй гаспадаркай тыя, хто ўмеў працаваць і не баяўся работы. Такім жа вырасла і пакаленне дзяцей хутаран, якія працавалі ў жывёлагадоўлі. «Памятаю, на планёрках старшыня калгаса паднімаў іншых загадчыкаў фермы, ушчуваў за нейкія хібы ў рабоце, а тыя тлумачылі, што жывёлаводы напіліся ды і не выйшлі на змену. Для мяне гэта было дзіўным. За ўсю маю работу не здаралася ніводнага падобнага выпадку».

ПЯЦЬ І АДЗІН

Яшчэ цікавы факт прывяла Алена Труцько. Усе чатыры яе цяперашнія аднавяскоўкі працавалі да пенсіі на ферме. Усе зараз маюць прыстойную пенсію, больш за 400 рублёў, што сведчыць аб вялікім стажы, добрай зарплаце. Што і казаць — працаўніцы былі.

Алена ТРУЦЬКО.

Выгадавалі годных дзяцей, усіх дзеці праведваюць, даглядаюць.

Алена Іванаўна цяпер наймаладзейшая з ліпаўцаў, астатнім у асноўным пераваліла за восемдзесят. Мабыць, з улікам іх шаноўнага ўзросту работнікі аўтакрамы прапаноўвалі кожнаму на падворак падвозіць прадукты. Дык яны адмовіліся. Прыйсці ў прызначаны час да аўтакрамы азначае сабрацца разам, пагаварыць, абмяняцца навінамі. Так і робяць два разы на тыдзень. Яшчэ раз на тыдзень прыязджае ў вёску пошта. І вельмі прасілі жыхаркі Ліпава адзначыць уважлівасць, чуласць іх паштовага работніка: кожную капеечку вылічыць, лішні раз кожнаму растлумачыць. Прывязе, скажам, па заказе мех камбікорму, дык не скіне пасярод двара альбо каля весніц, а спытае: куды паставіць. Здавалася б, дробязь, але сталыя людзі цэняць такое стаўленне.

Як і стаўленне да пенсіянераў тутэйшага фермера. Будынак былой фермы, якая ў савецкія часы была найлепшай у калгасе, купіў дзівінскі **фермер Эдзік АЛІЕЎ.** Менавіта так тут называюць выхадца з Азербайджана. Фермер гадуе авечак, коней. І адразу ўзяў шэфства над вясковымі пенсіянерамі. Пасадзіць, выкапаць бульбу перастала быць праблемай, бо ён заўсёды дасць трактар. А калі хто хоча купіць гатовыя клубні, то іх прывязуць проста на падворак, фасаваныя ў мяшкі, і складуць у склеп. Алена Труцько ўспамінала, як першы раз хадзіла да новага фермера купіць сена для казы, раней яна яшчэ трымала больш жыўнасці. «Тады думала, ці паслухае, ці адгукнецца на просьбу калгаснай пенсіянеркі вясковы бізнесмен, — са смехам успамінае яна. — А ён весела адказаў: «Не хвалюйся, гаспадыня, адзін каза пракормім». Пасля гэтага работнік фермерскай гаспадаркі прывёз сена і акуратна склаў у стажок. Так што з Эдзікам нам пашанцавала».

КУРОРТНЫ КРАЙ

Добра адзываюцца жыхары вёскі і пра маладых гаспадароў аграсядзібы «Ціхі край» **сужэнцаў ШЫНКАРУКОЎ.** Яны купілі некалькі дамоў на пустой вуліцы, наводдаль. Таму іх госці не перашкаджаюць пенсіянерам, там наогул не вельмі часта парушаюць цішыню. А з'яўленне гасцей асабліва з дзецьмі падтрымлівае адчуванне жыцця ў вёсцы, і Ліпава не выглядае выміраючым населеным пунктам, хоць і засталося ў ім, як ужо сказана, усяго шэсць жыхароў.

Летам тут, вядома, больш людзей, прыязджаюць, дзеці, унукі былых гаспадароў. Паводле слоў **старшыні Дзівінскага сельскага Савета Веры ПІКУЛЫ,** мясціна курортная: адразу за вёскай пачынаецца лес, недалёка возера. Зямля надзвычай урадлівая, яшчэ не так даўно дзівінцы стараліся браць участкі пад агарод у Ліпаве, так што для дачнікаў — рай, а не мясціны.

У вялікім доме, узведзеным у свой час калгасам, Алена Труцько зараз жыве адна. Дочкі прыязджаюць на выхадныя: адна жыве ў Кобрыне, другая — у Дзівіне. Раней і на рабоце паспявала, кіравала вялікай брыгадай, і карову трымала. Цяпер вось засталіся толькі куры ды пару індыкоў. «Чытаю, вяжу, гляджу тэлевізар, чакаю дзяцей», — расказвае гаспадыня. У гэты час раздаецца тэлефонны званок — дачка тэлефануе кожны дзень, цікавіцца здароўем. «Цяпер сувязь добрая, — працягвае Алена Іванаўна. — Ва ўсіх нашых пенсіянераў і хатнія тэлефоны, і мабільныя. Каб дзеці не хваляваліся». Вось так павярнулася жыццё. Былыя хутаране жылі без электрычнасці, без радыё, пра навіны маглі даведацца, калі выязджалі ў мястэчка ці ў горад, а за зямлю трымаліся, як за галоўнае ў жыцці. Прайшло нейкія гадоў шэсцьдзясят, іх нашчадкі маюць у вясковых хатах сродкі сувязі, якія дазваляюць наладзіць імгненныя зносіны хоць з Амерыкай, а зямля, купленая дзядамі, нікому стала непатрэбнай...

Святлана ЯСКЕВІЧ.

На экранах

ПАД ЖАНЧЫНАМІ

Супярэчнасці англійскага двара ў новым фільме Ёргаса Ланцімаса

Сёння ў пракат выходзіць гістарычна дакладная і ў той жа час па-мастацку самабытная драма «Фаварытка», што расказвае пра прыдворныя інтрыгі, у якіх задзейнічаны тры жанчыны Англіі XVIII стагоддзя. Фільм зняты знакамітым у фестывальным свеце грэчаскім рэжысёрам Ёргасам Ланцімасам і атрымаў ажно дзесяць намінацый на прэмію «Оскар», што зрабіла яго адным з лідараў па прэтэнзіях на статуэтку. Сапраўды, карціна з разумна разлічанай драматургіяй, абыгрываннем адваротнага боку ўлады, надзвычайнымі антуражам і касцюмамі, своеасаблівай, але не радыкальна, кінамовай і Рэйчэл Вайс з Эмай Стоўн у галоўных ролях дагаджае і нашым і вашым. І Венецыянскаму кінафестывалю, дзе атрымала Асаблівы прыз журы, і Амерыканскай кінаакадэміі.

Некаторыя намінанты на сёлетнюю прэмію «Оскар», можа, і выклікалі ў кінааматараў некаторую нязгоду, маўляў, блокбастар «Чорная Пантэра» выглядае кан'юнктурным выбарам, а павярхоўная «Багемская рапсодыя» — поп-прадуктам. Затое апублікаваны спіс выявіў і прыемны рэверанс у бок арт-кіно. Тут вам і намінаванне паляка Паўла Паўлікоўскага на найлепшага рэжысёра за фільм «Халодная вайна», і чорна-белая карціна «Рома» мексіканскага аўтара Альфонса Куарона таксама з дзесяццю намінацыямі, і нарэшце «Фаварытка».

Радыкал Ёргас Ланцімас, аўтар фільмаў «Клык», «Лобстар», «Забойства свяшчэннага аленя» ды іншых з іх працяглымі бязгучнасцямі і ўмоўнасцямі, якія трэба прыняць падчас прагляду, гэтым разам зрабіў вельмі зразумелую, выразную і лінейную карціну. То-бок фестывальную і ў той жа час глядацкую гісторыю, расказаную са своеасаблівым почыркам, праз якія аўтар іранізуе са слабай, капрызнай каралевы і прагнасці да славы дзвюх сваіх гераінь, ад якіх, між іншым, залежыць жыццё краіны і ход вайны з Францыяй. Карацей, насуперак стэрэатыпам пра такога роду прадукцыю фестывальны фільм глядзіцца «на адным дыханні».

У цэнтры інтрыг аказваецца каралева Анна (супер-роля Алівіі Колман), псіхалагічна залежная ад сваёй сяброўкі з дзяцінства, палюбоўніцы і фаварыткі Сары (Рэйчэл Вайс), што праз свой уплыў на каралеву літаральна ўзяла кіраванне краінай на сябе, а значыць, атрымала ў ёй неабмежаваную ўладу. Пакуль Сара займаецца палітыкай, складаннем плана, што Анна павінна сказаць ці зрабіць, а таксама супакойваннем і ўлагоджваннем каралевы ў асабліва балючыя моманты, у палацы з'яўляецца новая служанка Эбігейл (Эма Стоўн).

Знешняя простасць і пакорлівасць Эбігейл падманвае Сару, і ў выніку служанка ўступае ў спаборніцтва за прыхільнасць каралевы. Уласна гэта спаборніцтва на фоне вайны з Францыяй і лёгкай прысутнасці парламента з апазіцыяй і складае сюжэтную лінію фільма. Але як! Дзверы ў зачыненыя пакоі адчыняюцца, а ў іх днях мы бачым зусім непрыглядныя і далёка, здавалася б, не каралеўскія штрыхі.

Анна з яе капрызамі, страхамі, крыўдамі, слабасцямі, хваробамі становіцца аб'ектам для ў асноўным паспяховага маніпулявання, таму галоўныя целарухі і вынаходлівасць праяўляюць Сара і Эбігейл. Усё гэта выяўляе сляпую прагу ўлады, падводныя камяні высокага становішча і хісткасць двара, заклапочанага не столькі краінай, колькі самім сабой.

Да таго ж гісторыя каралевы Анны і інтрыг вакол яе стала выдатнай асновай для стварэння свету жаночага дамінавання і жаночых амбіцый, дзе мужчыны з парламента толькі вядуць вайну ды ў кароткіх сцэнах выказваюць справядлівую занепакоенасць падаткамі. То-бок у цэлым застаюцца на другарадных ролях пад абсалютным жаночым, часам нелегітымным, як у выпадку з фаварыткамі, кіраваннем.

Ці наўмысна, ці не, зачыненыя пакоі, у якія асабісты, блізкі і нават інтымнага роду ўваход даступны толькі жанчынам і на іх жа замыкаецца, сапраўды робяць свет падкрэслена жаночым. Прыкметна, што і дзяцей як неабвержных доказаў кантактаў з мужчынамі ні ў адной з галоўных гераінь няма, затое для каралевы «дзецьмі» з'яўляюцца трусікі.

Гэтаксама, як праз сканцэнтраваныя твары, статычныя планы ці сюжэтныя дэталі Ланцімас іранізуе з недахопаў сваіх гераінь, якія, знаходзячыся пры ўладзе, альбо ўвогуле не ведаюць, як кіраваць краінай, альбо зацікаўлены ва ўладзе як асабістым атрыбуце, рэжысёр іранізуе і з сучаснага жаночага руху. «Фаварытка» паказвае, што мінулае не такое ўжо скрозь мужчынскае, а калі пры ўладзе аказаліся тры жанчыны, інтрыгі і маніпуляцыі запаланілі прастору.

Але якая б іронія ці стаўленне тут ні праглядваліся, перадусім фільм зацягвае візуальна неэнергічнай, але шалёна займальнай барацьбой ды маятнікам пераваг каралевы.

У сетцы Silverscreen і Falcon Club Буцік Кіно «Фаварытка» будзе паказвацца да 13 лютага, у «Кінавідэапракаце» — да 20 лютага.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.59	17.48	8.49
Віцебск —	8.53	17.33	8.40
Магілёў —	8.49	17.38	8.49
Гомель —	8.40	17.40	9.00
Гродна —	9.13	18.04	8.51
Брэст —	9.08	18.10	9.02

Месяц

Апошняя квадра
28 студзеня.
Месяц у сузор'і Стральца.

Імяніны

Пр. *Апанаса, Кірылы, Марыі, Мікалая, Міхаіла, Уладзіміра.*
К. *Людвіка, Пятра, Яна, Яны.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

31 СТУДЗЕНЯ

У краіне

1892 год — нарадзіўся (г. Капыль) Алесь Гурло (Аляксандр Кандратавіч), беларускі паэт. У 1920-я гады працаваў у тэрміналагічнай камісіі Інбелкульта. Аўтар паэтычных зборнікаў «Барвенак», «Спатканні», «Зорнасць», апавяданняў, вершаванай драмы «Любоў усё змагае» і інш. На беларускую мову перакладаў творы Ф. Гладкова, Ш. Руставелі, А. Аўдзеенкі. Памёр у 1938 годзе.

1919 год — Прэзідыум УЦВК прыняў пастанову «Аб прызнанні незалежнасці Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі».

1926 год — створаны Камуністычны саюз моладзі Заходняй Беларусі (КСМЗБ) — аўтаномная частка камсамола Польшчы; існаваў да жніўня 1938 года.

1926 год — нарадзіўся (г. Мінск) Міхаіл Канстанцінавіч Міцкевіч, беларускі вучоны ў галіне тэхналогіі апрацоўкі металаў. Доктар тэхнічных навук. Майстар спорту па стэндавай стральбе. Сын Я. Коласа. З 1949 года працаваў у Фізіка-тэхнічным інстытуце НАН Беларусі. Аўтар навуковых прац па электрафізічных метадах апрацоўкі матэрыялаў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

У свеце

1019 год — пачалося княжанне ў Кіеве Яраслава Мудрага, сына Уладзіміра Святаслававіча і полацкай княгіні Рагнеды Рагвалодаўны. Яно працягвалася да 1054 года.



1910 год — нарадзілася Валянціна Грызадубава, савецкая лётчыца, Герой Савецкага Саюза. Была ўдзельнікам агітэскадрыллі імя М. Горкага ў 1934—1935 гадах, а з 1936 года стала ваенным лётчыкам. У 1937-м устанавіла пяць сусветных авіяцыйных рэкордаў вышыні, хуткасці і далёкасці палёту, а ў 1938-м здзейсніла беспасадачны пералёт з Масквы на Далёкі Усход, усталяваўшы сусветны жаночы рэкорд далёкасці палёту. 2 лістапада 1938 года ёй было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза — першай сярод жанчын. Валянціна Сцяпанаўна Грызадубава прайшла ўсю Вялікую Айчынную вайну, здзейсніла больш за 200 баявых вылетаў. З сакавіка 1942 года яна камандавала 101-м авіяцыйным палком далёкага дзеяння (пазней 31-м гвардзейскім бамбардзіровачным авіяцыйным палком), які аказваў дапамогу партызанскім атрадам. Знаходзячыся з 1946 года ў запасе, удзельнічала ў даследчай рабоце, была начальнікам лётна-выпрабавальнага цэнтра, намеснікам начальніка маскоўскага НДІ прыборабудавання па лётнай частцы, была дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР 1-га склікання.

1924 год — на 2-м з'ездзе Саветаў СССР зацверджана 1-я Канстытуцыя СССР.

УСМІХНЕМСЯ

Я размаўляю на трох мовах: іронія, сарказм і ненарматыўная лексіка.

— А куды падзеліся бабулькі, якія раней на лавачках каля дамоў усім праходзячым міма косткі перамывалі?

— У блогеры падаліся.

Лена была за раўнапраўе палоў, таму ў клубе ёй навалялі гэтак жа, як і мужу.

— Ты дзе зараз?

— Я там, дзе ніколі няма снегу...

— Турцыя? Іспанія? Балі?

— Не, на люку стаю.

Еўрапейскія студэнты збіраюць грошы на навучанне, нашы — на сесію.

— Хто ж пераможа ў барацьбе халадзільніка з тэлевізарам?

— Перамогуць тыя вытворцы, якія здагадаюцца ўбудоўваць тэлевізар проста ў маразілку.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 150.

Нумар падпісаны ў 19.30 30 студзеня 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12